БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА

10

ГОД КАСТРЫЧНІКА

З ГЭТЫМ НУМАРАМ ДА 10 ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА РАССЫЛАЕЦЦА НАШЫМ ПАДПІШЧЫКАМ ДАРМОВЫ ДАДАТАК—ПОРТРЭТ УЛАДЗІМЕРА ІЛЬЛІЧА ЛЕНІНА.

У гэтым нумары:

1. **Артыкулы**—Кнорына, Чарвякова, Каркліна, Танцеўцавай. Самахвалавай.
2. **Аддзелы**—У барацьбе за ўладу саветаў, Жыцьце і барацьба замежных рабочых і сялян, На абарону заваёў Кастрычніка, Перавыбары дэлегатак, Райённыя зьезды грамадзкіх працаўніц, Кастрычнік і быт, У ведах—сіла, Мэдыцынскія парады.
3. **П'есы**—В. Сташэўскага з дарэвалюцыйнага і пасьлярэвалюцыйнага жыцьця.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА.

Димановской, А. Нарозовой, Бураковой—Ваши материалы сейчас печатать поздно. Возможно, что частью используем когда начнется ясельная кампания.

П.—Артыкул „Сялянка ў працы спажывецкай каапэрацыі Бабруйшчыны" надрукуем у наступным нумары. Шкода толькі, што ён не перасыпан прыкладамі актыўных працаўніц, жывымі прыкладамі ўцягвання сялянак у каапэрацыю.

А. Вяскоўцу—„Зьезд жанчын-грамадзяніц" (Капыльскі раён). **Дэлегатцы**—„Аб Клічаўскім жаночым райзьезьдзе" (Бабруйская акруга). **Парахневіч**—„Падрыхт. праца да перавыбараў д-с і аб перавыбарах дэлегатак у в Карыйно і Убалоцьце". **Грынглаз**—„Як прайшла кампанія па падрыхтоўцы жанчын да райзьездаў". **К. Я.** „Больш такіх зьездаў"—усе вышэй пералічаныя заметкі друкаваць ня будзем, нічога цікавага.

Сялькорцы **Надзі, Тюфеевай, Жураўлёвай, О. Гайдук, В. Дворкинай, М. Бычанковай, Бабуляк, Ц. Гревневой, Зайцевой, Лифшицу, Шляфферу**—Ваши заметки получены с почты, когда номер журнала был уже сдан в печать и поэтому не вошли. Будут помещены в следующем ноябрьском номере.

В. Гараўскаму — Апавяданьне „У той вечар" захапляе з мастацкага боку: нязвычайна ўдаўся малюнак восені і працы ў сушні. Але кепска ўвязана псыхолёгічная канва, ненатуральны пераход камсамолкі Марылі да агітацыі за лёнамялку, трэба перапрацаваць.

С. Тюфеевой — Тетрадь стихов редакция получила. Некоторые из них печатаем в этом номере журнала. Пишете вы не совсем уж плохо. У вас даже встречается легкий юмор:

> Не хочет народ
> нашу власть признавать
> и скучно, и грустно
> и некому руку подать
> *„Песьня буржуйки"*

Есть и более серьезные, довольно удачные, места, построенные по такому-же принципу: часть куплета ваша, а часть выхвачена из известных русских поэтов. Такой прием хорош, когда пишутся куплеты для чтения на вечере—тогда надо придать им сатирический или юмористический характер. Если-же вы стихи пишете для печати в журналах, печатных газетах—нужно заняться более сер'ёзно. Чувствуется, что вы читали много из пролетарской поэзии 1917—23 года, когда в ходу была **голая** революционная фраза. Тогда она производила большое впечатление, но **сейчас**, в 1927 году, такие стихи очень слабы, не ценны. Сейчас голая революционная фраза уступает место **художественному** оформлению бытового материала, эмоциональной лирике, мотивам строительства. А эта тема у вас **совершенно отсутствует**. Работайте. Присылайте будем печатать, или давать указания.

А. Трапашцы—Працяг апавяданьня „Маці", некалькі нататак і артыкул „Пра што пяе вёска" атрымалі. Наконт апавяданьня дамо адказ спэцыяльна пісьмом. Нататкі зьмесьцім. Артыкул цікавы, каштоўны, але не апрацаваны. Просьба дапоўніць яго большым лікам частушак, песень, каб яны высьвятлялі рознастайнае жыцьцё вёскі (барацьба старога і новага, як перамагае новае, як глядзяць на гэта старыя, як глядзяць на гэта маладыя і г. д). Вы, праўда, ужо некаторую працу прарабілі, але яшчэ ня досыць (у далейшым зьвярніце асаблівую ўвагу на тое, пра што пяюць **дзяўчаты і жанчыны** зараз у вёсцы). Апрацуйце і дасылайце—надрукуем.

Зарніцкаму.—П'есу „Бацька і сын" атрымалі, але друкаваць нельга яе. Сюжэт у асноўным цікавы, але няўдала, ня досыць апрацованы. З боку сцэнічнага бадай таксама ёсьць заганы (падвойнасьць сцэны ў II акце). Раім зьвярнуцца да каго-небудзь у Віцебску, хто ведае драматычную справу і пагутарыць. Ён вам дасьць пэўныя практычныя ўказаньні. Гэта будзе вельмі карысна для вас і ў далейшай вашай працы.

Г. Жукоўскаму — П'есу „Няпісьменны — што сьляпы" атрымалі. У гэтым нумары часопісі, як спробу, друкуем п'есу В. Сташэўскага „Кацярына". Калі выявіцца ў далейшым патрэба ў друкаваньні час-ад-часу п'ес у часопісі—магчыма выкарыстаем і вашу.

П. Корбут—Ваши новые стихи получили, но очень печально, что печатать не можем—по настроению слишком уж не современные. Например, в стихе „Прости".

> Судьбой гонимый полечу я
> мне в неведомые края
> Тоски слезами не залью я,
> прости родная мать моя...

В наши дни эти стихи пахнут интеллигентски-разочарованным мечтательным настроением.

А. Крайку. „Дзеткам", **В. Жураўлёвай**—„Водпускніку 1903 г." **Н. Русаковай**—„Насустрэчу Кастрычніку", **Ж—авай** „Ня роўны дзень"—усе вышэй пералічаныя вершы вельмі слабыя і да друку ў часопісі не падыходзяць.

Менск, 1-ая Дзяржаўная друкаря. Заказ № 99. У ліку 3.000 экз. Галоўлітбел № 26.504.

ЦЕНТР. ГОСБИБЛИОТЕКА Т.С.С.Р.
Инв. №

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

Адрас рэдакцыі:
Менск, Савецкая вул, № 45
Тэлефон № 419

ОРГАН АДДЗЕЛУ ПА ПРАЦЫ СЯРОД ЖАНЧЫН ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

На 1 месяц	15 кап.
„ 3 „	45 „
„ 6 „	90 „
На год	1 р. 80 „

№ 10 (36) || Кастрычнік (октябрь) 1927 г. || № 10 (36)

В десятую годовщину Октября—пламенный привет работницам и крестьянкам

Десятилетие Великого Октября и женщина.

(Статья генерального секретаря ЦК КП(б)Б т. Кнорина).

Десять лет тому назад, 25 октября (7 ноября по н/ст.) 1917 года, рабочий класс нашей страны, при поддержке широких крестьянских масс, сверг правительство буржуазии. На вопрос, какое значение имеет рабочая и крестьянская революция 25-го октября, Владимир Ильич Ленин тогда же (26 октября на заседании Петербургского Совета) ответил:

„Прежде всего, значение этого переворота состоит в том, что у нас будет советское правительство, наш собственный орган власти, *без какого бы то ни было участия буржуазии. Угнетенные массы сами создают власть.* В корне будет разбит старый государственный аппарат и будет создан новый аппарат управления в лице советских организаций. Отныне наступает новая полоса в истории России, и данная третья русская революция должна в своем конечном итоге привести к победе социализма".

т. КНОРИН

Для преодоления сопротивления старых господствующих классов, для окончательной победы над помещиками и капиталистами, созданная 25 октября власть должна была быть особой формой власти—диктатурой пролетариата. Только власть, созданная по принципу диктатуры пролетариата, могла организовать весь рабочий класс под знамя Ленина и добиться победы над своей собственной буржуазией в гражданской войне, только такая власть могла отразить наступление иностранных капиталистических государств, только такая власть —диктатура пролетариата—могла справиться с нашей хозяйственной разрухой, голодом и холодом, и вывести страну на путь нового социалистического строительства.

За десятилетие диктатура пролетариата в нашей стране окрепла и стала силой, с которой уже не может справиться ни одно капиталистическое государство. Но перед властью диктатуры пролетариата, ведущей за собою крестьянство, стоит еще важнейшая и крупнейшая задача, для решения которой эта власть была создана. Эта задача — построить в нашей стране полное социалистическое общество. Для решения этой задачи направлена вся деятельность советского правительства и коммунистической партии, поддерживаемых сознательными рабочими всего мира. Формами решения этой задачи является — индустриализация страны, под'ем сельского хозяйства и кооперирование широчайших крестьянских масс, а также под'ем сознательности и культурности рабочего класса и крестьянства, без чего социализм не может быть построен.

Одной из форм решения этой задачи—построения в нашей стране полного социалистического общества—является также полное экономическое и политическое раскрепощение женщины, поднятие ее культурного и политического уровня и предоставление ей не только права по закону, но и возможности на деле принять, равное с мужчиной, рабочим и крестьянином, участие в общественно-политической жизни страны и в социалистическом строительстве.

Задача политического освобождения женщины ставилась всеми буржуазными освободительными движениями, но ни одно из этих движений не могло этой задачи решить. Даже в самых „демократических" и передовых капиталистических странах женщина не добилась еще полного политического равноправия, не говоря уже об экономическом раскрепощении работницы и крестьянки. И это понятно: не может быть речи о раскрепощении женщины до тех пор, пока существует капитализм, потому что неравноправие женщины есть одно из непременных условий существования капиталистического строя. Строй, который построен на угнетении одного класса другим, на частной собственности, праве наследования и индивидуальной семье, как первичной хозяйствующей ячейке, есть такой строй, при котором действительная свобода и равноправие женщины немыслимо. Действительное раскрепощение трудящихся женщин и установление действительного равноправия полов, не только перед законом, но и на деле, становится возможным только после свержения власти эксплоататорских классов, уничтожения частной собственности и начала переустройства общества на социалистических началах. Поэтому, полное и окончательное раскрепощение трудящихся женщин, установление полного равноправия полов, действительное широкое участие женщин в общественно-политической жизни оказалось возможным впервые в мире при власти советов.

Раскрепощение женщины есть одна из задач социалистической революции. Обеспечение полного равноправия и равного участия обоих полов в общественно-политической жизни есть одна из насущных задач социалистического строительства. Поднятие отсталой, веками забитой, женской массы для активного участия в общественно-политической жизни, культурно-политическое перевоспитание женских масс есть одна из важнейших задач культурной революции, которую нам нужно проделать для того, чтобы создать полное социалистическое общество.

С первого дня существования советской власти, были законом отменены все существовавшие для женщины ограничения и предоставлены матери и ребенку такие права, каких нет и не может быть ни в одном буржуазном государстве.

Вопрос об освобождении трудящейся женщины не есть только вопрос законодательства, а есть вопрос перестройки быта. Советская власть должна была поставить женщину в равные условия при заключении и расторжении брака и, больше того, особо поддержать ее, ибо, без особой поддержки законом и властью слабейшей стороны, не может быть установлено фактическое равноправие. Советская власть должна была установить фактическое равенство при крестьянских семейных разделах. Советская власть должна была поставить своей задачей организацию помощи роженицам, организовать ясли и детские сады, общественные столовые и прачешни, ибо без этого не может быть изменен старый быт, имеющий в своей основе закабаление женщины.

Равное участие полов в общественно-политической жизни, одна из задач, которая должна быть нами решена—задерживается отсталостью женских масс. Поэтому перед нами с особой остротой стоит вопрос о культурном под'еме женщины. Женская часть трудящихся менее грамотна, а без грамотности нет участия в политической жизни, без постоянного чтения газеты нет политики, а есть только сплетня, предрассудки и т. д. Добиться безусловного обслуживания всех девочек хорошей советской школой, ликвидации азбучной неграмотности всей женской частью взрослого населения, постоянного каждодневного пользования женщиной работницей и крестьянкой советской газетой и книгой, добиться не только грамотности, но свободного времени для грамоты, которое до сих пор занято кухней, детьми, стиркой белья—вот условие культурного под'ема женщины. Осуществление этих условий, элементарнейших условий культурности, обеспечит не только освобождение женщины от власти религии, сплетен, предрассудков, но и обеспечит их активное участие в общественно-политической жизни.

Ленин не в шутку сказал, что каждая кухарка (т. е. каждая, даже самая отсталая, женщина) должна научиться управлять государством. Но для выполнения этой задачи, прежде всего, нужно ликвидировать семейную кухню и развить дело общественного питания, нужно дать женщине-кухарке и няньке грамоту и время для грамоты, нужно ее втянуть в общественную работу.

Советская власть и коммунистическая партия проделали уже большую работу по втягиванию женщины-работницы и крестьянки в общественную работу. Проходившие только что с'езды женщин, членов советов, являются лучшим показателем этого. Но это только скромные зачатки. Нам нужно еще больше приналечь на это дело. Женщине-общественнице нужна особая поддержка, ее нужно особо обучать на деле. Делегатские собрания есть прекрасная школа общественной работы для женщин и они должны пользоваться особой поддержкой партии и советского государства. В них выделяются и обучаются новые женские кадры. Нужно еще больше женщин вовлечь в нашу партию. Нужно гораздо больше девушек вовлечь в комсомол и воспитать их на активной комсомольской работе. *Нужно помочь женской молодежи найти путь к общественной работе. Только так мы осуществим ленинский завет и научим каждую, даже самую отсталую женщину, принимать активное участие в общественно-политической жизни и управлять государством.*

Дело освобождения женщины есть дело самих трудящихся женщин, но это дело должно пользоваться всемерной поддержкой всей партии и советской власти. Без активного участия женщин нельзя построить социалистическое общество. Без культурного и политического под'ема всей женской массы не может быть нового общества. Больше того, *ни одна из задач социалистического строительства не может быть разрешена без активного участия женщин, целой половины трудящихся.* Мы же живем и работаем для того, чтобы строить и построить новое социалистическое общество. Поэтому итоги десятилетия должны дать нам новые силы для еще более энергичной борьбы за раскрепощение женщины и равенство полов во всей нашей работе. Это одна из важнейших задач социалистического переустройства общества и культурной революции.

У БАРАЦЬБЕ ЗА ЎЛАДУ САВЕТАЎ.

УДЗЕЛ РАБОТНІЦ ДЫ СЯЛЯНАК У БАРАЦЬБЕ ЗА САВЕЦКУЮ БЕЛАРУСЬ.

(Успамін старшыні ЦВК БССР і СССР т. Алеся Чарвякова).

Перад рэволюцыяй 1917 году.

Рабочыя ды сяляне Беларусі знаходзіліся ў дні царызму ў вельмі цяжкім матар'яльным, культурным ды палітычным становішчы. Малы заработак, адсутнасьць асьветы, паліцэйскі ўціск—вось чым адзначаліся для працоўных тыя часы. Асабліва цяжкае становішча было жанчын. Эксплёатацыя жанчын перавышала ўсялякую меру.

А. Чарвякоў.

Аўдоцьця Васілёва Іванова—Пятрыкаўскага раёну, Мазырскае акругі—расказвае, што яна з 9 гадоў пайшла служыць да памешчыка і служыла 3 гады за плату па 2 рублі ў год.

Калі ў 1900 годзе ў горадзе Чэрыкаве адчынілася панчошная фабрыка Гіндзенбаума, то работніцы там працавалі з самай раніцы да 12 гадзіны ночы і зараблялі ад 2 да 6 рублёў у месяц; 6 руб. зараблялі больш здольныя і абучаныя. Вучні-ж першыя 2-3 гады нічога не зараблялі.

Агульная беднасьць беларускага сялянства асабліваю цяжкасьцю падала на жанчыну, бо на жанчыну-сялянку падаюць усе клопаты па сваёй хаце, каля сваіх дзяцей.

Цяжкае становішча рабочых ды сялян прымушала іх вясьці рэволюцыйную барацьбу супроць паноў, капіталістых і іх абаронцы—цара. Работніцы ды сялянкі ішлі на барацьбу разам з рабочымі ды сялянамі.

Рэвол. рух сярод работніц.

У 1903—1904 годзе на Чэрыкаўскай панчошнай фабрыцы (аб якой ужо гаварылася) працавала да 120 работніц. Сярод работніц вялі падрыхтоўчую рэволюцыйную працу іскраўцы. (Так называлася бальшавіцкая частка партыі соцыял-дэмократаў). Сярод работніц выявіўся актыў—перадавікі з больш сьвядомых работніц.

У 1904 годзе работніцы аб'явілі першую забастоўку, выставіўшы патрабаваньне скарачэньня рабочага дню ды павялічэньня зарплаты. Найбольш перадавымі работніцамі былі *Соня Райхенштэйн, Ашкіназі Фрума, Ліба Гусман, Бася Кац* ды шэраг іншых. Яны праводзілі гэту забастоўку, за што іх арыштоўвалі, жандармэрыя біла. Забастоўка цягнулася 2 тыдні і кончылася перамогай работніц больш, чым на 50 проц.

У 1905 годзе на шкляным заводзе „Ноўка" Віцебскае акругі жанчыны-работніцы вязальнага цэху пачалі забастоўку, патрабуючы павялічэньня заработку да 4 кап. за 1000 штук, рамонту памяшканьня, больш далікатных адносін да работніц ды звальненьня з работы сына ўпраўляючага заводу Дюіса. Забастоўка цягнулася блізка 2 тыдняў. У сувязі з забастоўкай была арыштавана работніца *Крашэўская*. Крашэўская хавала палітычную літаратуру, але зьнішчыла яе да свайго арышту. Работніцам абяцалі задавольніць іх патрабаваньні, і забастоўка спынілася.

Але потым заработная плата была паднята толькі на 2 кап., рамонту памяшканьня не зрабілі.

Батрачкі дапамагаюць паўстанцам.

1905 год адзначыўся ў Беларусі сялянскімі паўстаньнямі. У гэты час на Магілеўшчыне вызначыўся іспраўнік *Мізгайла*, які распраўляўся з паўстанцамі. Мізгайла з атрадам стражнікаў прыехаў у Горадзішчанскую воласьць на абарону абшарнікаў і астанавіўся ў абшарніка Сіпайла. Батрачка гэтага пана (на жаль, мы ня ведаем яе прозьвішча) пабегла за шэсьць вёрст да паўстанцаў-сялян ды папярэдзіла іх. Гэта дало магчымасьць паўстанцам сваячасова перайсьці ў другое месца і працягваць сваю барацьбу супроць паноў.

Паўстаньне сялянак супроць паноў.

У Вепрынскай воласьці Чэрыкаўскага павету панаваў вядомы абшарнік *Васілеўскі*, які зьдзекаваўся над сялянамі. Сяляне гэтае мясцовасьці ня мелі сенажаці. Лес таксама быў панскі. Сяляне вымушаны былі пасьці сваю жывёлу ў панскім лесе, за што пан забіраў пры дапамозе стражнікаў кароў, накладываў штрафы і г. д.

У часы вайны, у 1916 годзе, памешчык прывёз стражнікаў і жандараў дзеля расправы з сялянамі. У хатах былі ў большасьці жанчыны, бо мужчыны былі на вайне. Жанчыны ўхапілі граблі, косы, палкі ды кінуліся абараняць сваю жывёлу. Шмат жанчын было ранена ды арыштована. Двох сялян адправілі ў Сібір.

Рэволюцыйныя організацыі сярод саматужніц.

Саматужніца-краўчыха з мястэчка Ляды на Аршаншчыне Х. З. Зільберброд так расказвае аб працы сярод саматужніц: у 1904 годзе я працавала тайна ў м. Лядах. Бацькі гналі мяне з дому, ха-

валі маю адзежу. Аднак, я ні перад чым не астанаўлівалася: вывучала разам з таварышкамі ў гуртках, дзе-небудзь за мястэчкам, або на тайных кватэрах ноччу політычную эканомію, чыталі рэволюцыйныя кніжкі. 1-га мая мы сабраліся ў лесе, дзе на нас напаў буржуй (яўрэй) Гугель. Гугель высек мяне розгамі і грозіўся, што паедзе за паліцыяй. Я хавала прокламацыі зімой у муфту, а летам у панчохі. Часта, па заданьню нашага гуртку, я раскідала проклямацыі, або наклейвала іх ноччу на слупох па мястэчку. Разам за мной у нашым гуртку працавалі: Маня Бернштэйн—краўчыха, Рэйзла Хайнінсон, Іта Абкіна, Ціпа Кацэв. Мы часта хадзілі ў вёскі, каб наладзіць сувязь з сялянскімі жанчынамі.

Работніцы ды саматужніцы бароліся за палепшаньне свайго палажэньня шляхам забастовак. Вельмі рана сярод работніц і кустарак пачалі працаваць рэволюцыйныя партыі, з якіх партыі бальшавіцкага напрамку карысталіся асабліваю ўвагаю. Работніцы, як больш сьвядомыя, хадзілі ў вёскі, каб падняць сялянак, каб уцягнуць іх у барацьбу, каб павясьці іх за сабою.

Зразумелая рэч, што беднасьць, забітасьць, цемра вёскі, усялякія папоўскія забабоны моцна трымалі жанчыну-сялянку ў сваіх капцюрох і прымушалі яе пакарацца ды плакаць аб сваёй горкай долі. Гэтыя сьлёзы сялянак былі адбіткам вялікага гора працоўнага народу. Гэтыя сьлёзы сьведчылі аб тым, што *самая забітая і цёмная жанчына сваім пачуцьцём, сваім сэрцам была з тымі, хто вядзе барацьбу за лепшую будучыню.* Даходзячы да адчаю, жанчыны-сялянкі разам з сялянамі браліся за косы, граблі, вілы і ішлі супроць народных крывасмокаў—паноў-абшарнікаў і іх абаронцаў—жандараў. Так жанчыны-работніцы ды сялянкі паступова, на практыцы праходзілі школу барацьбы за лепшую будучыню, вялі барацьбу разам з рабочымі ды сялянамі супроць паноў. Рэволюцыйная барацьба руйнавала фундамант царскага панаваньня і набліжала вызваленьне працоўных.

1917 год.

Калі ў лютым месяцы 1917 году скінулі цара, то рабочыя ды сяляне лічылі, што за царом трэба прагнаць наогул усю буржуазію, забраць у паноў зямлю, у капіталістаў фабрыкі, банкі і замацаваць уладу рабочых ды сялян.

Буржуазія, наадварот, лічыла, што, калі ўдалося скінуць няздольнага п'яніцу-цара, то трэба ўстанавіць такі парадак, каб улада буржуазіі была яшчэ больш моцнаю.

Часовы ўрад Керанскага вёў буржуазную палітыку. А рабочыя ды сяляне, бачачы, што іх абдурываюць самі, пад кіраўніцтвам бальшавікоў, пачалі заводзіць новыя парадкі: адбіраць зямлю і гэтак далей. Вось цікавы абразок падзей тых часоў. (Расказала сялянка вёскі Царкоўшчына, Касьцюковічскага раёну, Калінінскае акругі—Ларчэнкава Матруна Мікітава, 34 гадоў).

„Прышоў 1917 год. Сяляне добра памятавалі аб панскіх зьдзеках у 1905 годзе, калі жандары, пад камандай абшарнікаў Свадкоўскага і Камінскага, палілі сялянскія хаты, у тым ліку і нашу хату, забіралі жывёлу, білі сялян. У нашай вёсцы пачалі гаварыць аб тым, каб прагнаць абшарнікаў. Адзін раз сабраліся сяляне ды пайшлі ў маёнтак Фэліксберг, каб прагнаць паноў. Калі падышлі бліжэй, сыны пана, а разам з імі і некалькі салдат пачалі страляць. Сяляне ды сялянкі раней спужаліся, а потым усхапілі, хто вінтоўку, хто двустволку, палкі і кінуліся на дом. Я ўбачыла, што сын пана Камінскага схаваўся за гумно і нешта запісвае. Я стрэліла раз-два і забіла пана; узяла ў яго плян нашай мясцовасьці, аружжа і аддала брату. Потым разам з другімі я пайшла выкідаць панскіх служак з маёнтку Свадкоўскага. Потым мы ўстанавілі ў нашай вёсцы варту ад паноў. Я разам з другімі хадзіла на дзяжурства і назначала каравульных. Зямлю маёнткаў мы падзялілі сярод сялян. Там, дзе раней так прыгнечывалі сялян, цяпер пролетарская камуна Бухарына.

Нямецкая акупацыя.

Немцы захапілі большую частку Беларусі. У гэты-ж самы час на Беларусі йшла організацыя польскіх легіёнаў. Пад абаронай нямецкіх ды польскіх акупантаў паны-абшарнікі, капіталістыя, чыноўніцтва ізноў паднялі голаў і пачалі варочацца на Беларусь, аднавіўшы зьдзекі над рабочымі ды сялянамі. Працоўныя Беларусі пачалі рашучую барацьбу супроць акупантаў. Не адставалі і жанчыны.

Сялянка вёскі Пільчыць—Самукова, даведаўшыся, што на партыйца Лабатага мае быць напад контр-рэволюцыянэраў, папярэдзіла Лабатага, спасла яму жыцьцё і наогул не дала магчымасьці выкрыць партыйную арганізацыю.

Жанчыны вёсак Гарадзішча, Пільшац і іншых запрашывалі ў хаты пад рознымі відамі легіёнэраў, а мужчыны адбіралі ў легіёнэраў аружжа. Так было абезаружана 300 легіёнэраў. Сялянка-бяднячка Сапік Алёна з вёскі Цягніцы, Бялынічскага раёну расказывае: у 1918 годзе ў часы акупацыі Магілеўшчыны польскім ды нямецкім войскам сяляне дапамагалі чырвоным усялякімі спосабамі. Сама Сапік была ўпоўнаважаным ад сялян: яна насіла чырвоным патрэбныя ведамкі: бумагі яна хавала ў лапаць і хадзіла пехатой 40—50 вёрст.

Рая Селецкая, Борухова і Француз з гораду Быхава вялі працу ў часы нямецкай акупацыі сярод нямецкіх салдат. У верасьні 1918 году разам з іншымі таварышамі яшчэ пры немцах яны арганізавалі профэсыянальныя саюзы. Тав. Вайнер вельмі актыўна вяла тайную работу сярод нямецкіх салдат: яна знаходзілася ў сувязі з нямецкімі бальшавікамі-спартакаўцамі, раскідала літаратуру.

Расьніцова Роза, радзіўшаяся ў Зябянскім с/савеце, Чэрыкаўскага раёну, пры наступленьні палякаў у 1918 годзе на Магілеў, пабегла ў Чэрыкаў. Там яна паступіла ў партызанскі атрад Кутузава і потым уцягнула сваю сястру Дашу. Калі атрад уліўся ў чырвонаармейскі атрад пад камандай „Розэ", Расьніцова Роза накіроўваецца з атрадам на Заходні фронт.

Сіламі працоўных Беларусь была вызвалена. Немцы прымушаны былі пакінуць Беларусь. Часовы работніцка-сялянскі ўрад ад імя рабочых, сялян, работніц ды сялянак агаласіў 1 студзеня 1919 году ўтварэньне незалежнай Савецкай Соцыялістычнай Беларускай *Рэспублікі.*

1917 год

Польская окупацыя.

Польскія паны не хацелі прымірыцца з тым, што ў іх аднялі маёнткі. Таму адрадзіўшаяся панская Польшча старалася заняць Беларусь, каб вярнуць польскім паном іх панаваньне. Польскім паном дапамагалі капіталістыя іншых дзяржаў: Францыі, Англіі, Амэрыкі, якім хацелася вярнуць у Расіі старыя парадкі. Чырвоная армія ў гэты час толькі арганізоўвалася. Польскія легіёны, адзетыя ў ангельскую вопратку, накормленыя амэрыканскім салам і пад камандай французскіх афіцэраў, пачалі занімаць Беларусь і прасунуліся да Бярэзіны, захапіўшы палову нашай краіны. Гэта окупацыя была сьмяртэльнай пагрозай Савецкай уладзе: на савецка-польскім фронце вырашалася пытаньне—быць ці ня быць *саветам*.

Усе сілы савецкіх краін былі накіраваны на барацьбу з панамі. Чырвоная армія—на фронце, рабочыя—на фабрыках, сяляне на гаспадарцы,—усе працавалі на абарону, аддавалі апошняе, каб дапамагчы Чырвонай арміі. Цяжкія гэта былі часы.

Рабочыя ды сяляне, што асталіся ў польскай акупацыі, падняліся супроць паноў, пайшлі ў партызаны. Барацьба супроць паноў кіравалася Комуністычнай Партыяй.

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай Партыі Літвы і Беларусі (ЦК ЛІТБЕЛ) быў у Смаленску. Яму трэба было мець сувязь з тайнымі бальшавіцкімі арганізацыямі ў акупацыі.

Першы кур'ер ад ЦК у Менскі бальшавіцкі падпольны камітэт была—Эдзя Зоймач—літвінка, дамашняя работніца, 16 гадоў. Яна перайшла цераз фронт, маючы пры сабе шыфр (патайную азбуку). У Менску яна была арыштавана. У турме Эдзю білі, садзілі іголкі пад пазногці, білі рэзінавымі палкамі па пяткам. Але Эдзя шыфр захавала, нікога ня выдала. Зьдзекі зламалі здароўе маладой, прыгожай, здаровай дзяўчыны, і яна памерла ў Беластоцкай турме.

Падпольныя арганізацыі Менску з свайго боку шукалі сувязі з ЦК. Адным з першых пасланцоў у Смаленск з Менску была Соня Крэмер (сучасная загадчыца жанаддзелам). Яна некалькі разоў перабіралася ўсялякімі хітрыкамі (прыкідвалася вар'яткай) праз фронт, перавозіла грошы, шыфры і г. д.

Пад кіраўніцтвам Компартыі партызанская барацьба вельмі пашырылася.

Падпольная партызанская рэволюцыйная работа заўжды патрабуе ўдзелу жанчыны. Вось некалькі абразкоў, як іх апісваюць самі ўдзельніцы.

Акуліна *Сьцяпук* з вёскі Капаткевіч, Мазырскае акругі: „У мяне ў хаце стаяў тэлефон чырвоных. Калі прышлі палякі і занялі сяло, адзін тэлефоністы застаўся з тэлефонам у руцэ і ня ведаў, што яму рабіць. Бальшавікі ўжо вышлі, а ён кінуўся за імі. Я вышла ў той час на вуліцу і ўбачыла гэта. Я пазвала яго к сабе і захавала ў сене, куды насіла яму есьці. У мяне ён прасядзеў тры дні, а на чацьверты я выправіла яго ў Мышанку, дзе былі бальшавікі. Тэлефон ён пакінуў у мяне, я яго захавала, а калі вярнуліся чырвоныя, я ім аддала".

Сьцёпа *Сьцяпук*—45 гадоў, з вёскі Гарадзішча, Капаткевіцкага раёну: Калі прышлі палякі і занялі нашу вёску, некаторыя бальшавікі не пасьпелі схавацца. Я насіла есьці бальшавікам, каб ня бачылі палякі. Адзін бальшавік прышоў у гэты час да нас. Я дала яму вопратку майго мужа: нагавіцы (шганы), шапку, рубаху, прыняла яго сваім сынам. Ён хадз ў працаваць. Праз некалькі дзён прышлі да мяне на вобыск, бо нехта стаў даказываць, што ў мяне жыве бальшавік. Я захавала яго ў сена на-

...І так енчыла ўся Беларусь.

шага суседа, бо ў нашым сене шукалі. На чацьверты дзень мой чалавек вывеў яго лесам на тую дарогу, дзе знаходзіліся нашы бальшавікі".

Шовель Ганна, 60 гадоў, Пухавічскага раёну хавала ў сябе каля месяцу двох бальшавікоў.

Вельмі прыгожыя абразкі дае Бабруйская акруга. Сялянкі прыймалі актыўны ўдзел у рабоце партызанскіх атрадаў, дапамагалі сваім сынам, мужчынам, насілі ім есьці, прыносілі ведамкі аб белапаляках. Асабліва многа такіх прыкладаў у Рудобелке, Лясковічах, Глуске, Гарадке.

Сялянка Дар... 50 гадоў Гарадкоўскай воласьці сама паслала свайго сына Аляксея ў партызаны, хавала ў сваёй хаце камандзіра партызан т. Леўкова. Леўкоў спаў на сене, калі прышлі палякі, каб рэквізаваць сена. Каб спасьці Леўкова, яна пазвала палякаў у хату, патрактавала іх яечкамі, куранём. У гэты час яе дачка папярэдзіла Леўкова, і ён пасьпеў уцячы.

Каля Рудобелкі было блізка 500 партызанаў, якія вялі барацьбу з белапалякамі. Палякі абкружылі партызанаў з усіх бакоў, каб іх зьніштожыць. Тады Алеся *Одынец*—дзяўчына-сялянка парашыла папярэдзіць партызан. Яна ўбралася быццам у царкву да пана на споведзь. Прашла Алеся пехатой некалькі дзесяткаў вёрст, прабралася праз польскі фронт і сваячасова папярэдзіла партызан аб небясьпецы.

Гарэлік Надзя—дамашняя работніца, 40 гадоў, спаўняла даручэньні па сувязі з партызанамі, была арыштована пры паляках.

Больш сільныя ды моцныя жанчыны ішлі ў Чырвоную армію. *Манюк* Алёна і *Харытончык* Вольга з Пухавіцкага раёну прабылі ўсю вайну ў баявых палках чырвоных супроць Дэнікіна і белапалякаў.

Сялянка *Сьцельмахова* з вёскі Пешчанка, Княжыцкага сельсавету Магілеўскага раёну пайшла ў Чырвоную армію байцом. Цяпер працуе на гаспадарцы.

Іванова Аўдоцьця з Мазыршчыны, якая служыла ў абшарніка, а потым на фабрыцы, таксама пайшла ў Чырвоную армію. Яна падносіла патроны, мыла бялізну. Чырвонаармейцы яе кахалі за стойкасьць і адданасьць справе рабочае клясы. У баю пад Каразбакскай дачай яна была ранена і адпраўлена ў шпіталь у г. Себеж. Цяпер Іванова працуе вартаўніцай Пятрыкоўскага нардому і зьяўляецца актыўнай дэлегаткай.

Розман Мар'я Маркаўна з мястэчку Ельску, Мазырскае акругі, краўчыха, была ў 1919 годзе загадчыцай Мазырскага павятовага аддзелу Сацыяльнай забясьпекі. Пры падыходзе палякаў яна паступіла на броне-параход у якасьці чырвонаармейца. Розман была ранена ў нагу. Пасьля яе назначылі брыгадным камісарам санітарнае часткі 57 дывізіі.

Усе гэтыя прыклады лепш за ўсё сьведчаць аб тым, што рабочыя ды сяляне, работніцы ды сялянкі Беларусі хацелі скарэйшай перамогі над польскімі панамі і сусьветнымі капіталістымі. Усе працоўныя вялі барацьбу супроць сваіх ворагаў, працоўная жанчына была разам з усімі працоўнымі, і гэта забясьпечыла перамогу. Чырвоная армія перамагла армію капітала. 11 чэрвеня 1920 году Чырвоная армія разам з усімі працоўнымі Беларусі прагнала палякаў з Менску, а потым і з Беларусі. Беларусь стала *вольнай,* рабоча-сялянскай *краінай.*

(Працяг будзе).

В БОРЬБЕ ЗА СОВЕТСКУЮ ВЛАСТЬ.

(*Воспоминания*)

Я родилась в 1882 году в г. Радомысле, Киевской губернии, в бедной семье. Мать моя умерла, когда мне было 10 лет.

Когда мне исполнилось 13 лет, меня отдали работать на бумажную фабрику. Там я работала до тех пор, пока меня не уволили за распространение прокламаций.

Н. Разумовская

После увольнения через 3 года, я поехала в Киев, где нанялась в услужение. Понемногу я стала ознакамливаться с рабочими, состоящими в организации „Бунд". Они меня втягивали в эту организацию (это было в 1902 г.). На подпольном собрании меня, вместе с другими, арестовывают. После моего выхода из тюрьмы, я начинаю принимать активное участие в подпольной работе. В моей квартире хранится оружие, литература и т. п. Так проходило до 1905 г., а в 1905 г. я вынуждена была уехать в Мозырь, в виду больших арестов и обысков, где я продолжаю работу вместе с другими женщинами, Горелик Г., Гурецкой Э., Заяц Г. и др. Наша работа опять-таки состояла в том, чтобы сохранять оружие, литературу.

45-50 женщин работало на спичечной фабрике „Молния", которые приняли активное участие в забастовке, после каковой начались аресты, какие не миновали и Горелик, Гурецкой и др. Горелик отсылают на каторгу.

В 1905 г. организовывается боевой отряд. В этом отряде ранили Гурецкую.

Наша работа, т.-е женщин, заключалась в том, чтобы забирать бомбы, которые выделывал Симановский. С нами работала Заяц Г., за которой начала следить полиция и мне пришлось переправить ее через границу из деревни близ Чернобыля (с нею был еще и Симановский). Вскоре после их от'езда, полиция пришла к их родителям на обыск и меня арестовали, но так как я была с маленьким ребенком, то меня долго не держали.

Состояние полит-заключенных было неблагоприятное и мы решили организовать общество, называемое „Красный Крест". В тюрьму тогда не допускали ничего, и мы решили действовать иначе.

Открыв лавочку, мы туда зазывали городовых, поили их водкой и, таким образом, могли передавать все в тюрьму. Устраивали и такие штуки: когда начинались большие обыски и оружие находящееся в моей квартире надо было лучше обеспечить, тогда мы собирались, устраивали как бы свадьбу, куда приглашали и городовых, шнырявших возле дома, спаивали их, и успевали сделать все что нужно.

Гурецкая опять попадает под арест и ее отсылают в Пинскую тюрьму. „Красный Крест" снабдил меня деньгами и я уезжаю в Пинск, и, при помощи этих денег, освобождаю ее из тюрьмы. Но тут уже нельзя было больше жить в Мозыре, так как мы стали очень хорошо знакомы полиции и мы переезжаем в г. Киев.

В Киеве продолжаю работать подпольно. У меня на квартире помещается подпольная типография (Это было уже в 1909-1910 г. г.). Так работа идет до 1912 г., Мы переехали опять в Мозырь, где уже все время и работаем. До 1917 г. все идет нормально. В 1918 г. приходят немцы. Арестовывают Горелик и Малыкина. Моя работа—носить письма, передавала их всяким способом: брала хлеб, вынимала мякиш, вкладывала туда письма, затем вкладывала опять мякиш и таким образом передавала.

После немцев в Мозырь пришли петлюровцы. Не все коммунисты успели убежать. Одним из оставшихся является Голодец. И я, принарядивши его женщиной, с большим риском провожаю его до реки, возле фабрики „Красный Октябрь" и таким образом он через реку переезжает в Калинковичи (а за его голову назначена сумма в 1000 р.)

Через некоторое время пришли поляки и меня выдает сторож польских кладбищ. За мной начинается погоня... Я ухожу в Юревичи, где брожу некоторое время по полям. Потом пришла в местечко, где проходила 2-3 недели и поляки начинают меня и там искать. Благодаря некоторым врачам, как Ермолинский, Оффенгенден и др., мне удается приехать опять в Мозырь.

Поляки, как известно, издевались. Когда они захватили советскую столовую, в которой я работала, каждый, кто заходил выпить воду, раньше давал мне выпить, а потом уже пили сами.

По выходе поляков я, вместе с другими членами Бунда влилась в Коммунистическую Партию в 1920 г. и с тех пор нахожусь в ее рядах.

Н. Разумовская.

г. Мозырь.

Помняць сяляне і сялянкі сваю барацьбу.

Жанчыны Крупіцкага сельсавету помняць, як у 1918-19 годзе іх бацькі, мужы, сыны, браты змагаліся за рабоча-сялянскую ўладу. У 1918 годзе ў вёсцы Кайкава зарганізаваліся сяляне і пайшлі супроць пана, выбралі свой камітэт з трох чалавек, які глядзеў за парадкам, браў хлеб з двара і даваў бедным.

Цераз скоры час выбралі батракі ў дварох Кайкава і Анопалі рабачком з 3-х чалавек. З гэтых рабачкомаў выбралі ўпраўляючага абодвымі дварамі, які добра глядзеў за парадкам, а пасьля быў партызанам.

З лесапільнага заводу далі бедным сялянам коні; рабочыя ўзялі завод пад сваю ўладу і таксама вялі працу добра.

Праз некалькі тыдняў белапалякі прышлі. З першага прыходу сталі страшыць сялян бізунамі і забойствамі (забілі аднаго рабочага, ідучы з работы; аднаго маладога селяніна зьбілі да палусьмерці), у сялян забіралі коняй, кароў, сялян зьбівалі.

Сяляне кідалі вёску і ўходзілі ў партызанскія атрады. Шмат сялянак засталіся ўдовамі, шмат партызанаў асталося калекамі. Помняць сяляне і сялянкі сваю барацьбу. **Ц. Сьвірыноўская.**

Савецкая ўлада—наша ўлада.

Мне як-то раз прышлося разгаварыцца з аднэй 70-летняй бабулькай з вёскі Маркоўшчыны (Полацкая акруга).

— Ну што-ж ты, дзетачка, робіш, ходзя па сьвету,—пытае бабуля.

— А вот, бабулька, я склікаю сходы жанчын і расказываю ім пра іхнія правы, што дала ім савецкая ўлада, організую гурткі розныя, дзе яны вучацца пісаць, чытаць. Ім гэта патрэбіцца ў жыцьці. Граматнаму чалавеку лягчэй жыць, будаваць сваю дзяржаву.

— Маё-ж ты дзіцятка! Зо што гэта ўлада вытварае. А ці-ж гэта было пры старой пары? Як яшчэ Ляксандра быў трэці, тады ўсе казалі пра нейкую слабоду, але яе ніхто і ня бачыў. Каму яна засталася, хто яе ведае.

— Як каму? Тады зямлю далі сялянам і волю.

— Зямлю далі ім? Калом у горле стала зямелька мужыку. Далі, але столькі мужыкі рабілі на пана, а грошы плацілі за розныя арэнды, подаці, ды дзе там усё пералічыш. А навуку толькі багатаму можна было пазнаць. Раней толькі папы ды памешчыкі ў валасьцях сядзелі, а цяпер іх няма там. Нават, глядзі, з нашай вёскі служыць хлапец і дужа добры для сялян, усе яго хваляць. І мой-жа сын вучыцца ў Маскве, тожа будзе добры работнік.

— А ці помніш, бабулька, як да нас савецкая ўлада прышла?

— Як-жа—помню. Гэта ўлада — яна наша, нашы сыны ёй камандуюць. Шут іх ведае, нашы-ж бабы і тыя ў нейкія алегаткі запісаліся, то нешта робяць. Дык вось, дзіцятка, працуй шчасьліва і ведай, што паганая была ўлада пры цары.

Жукава.

Няхай жыве ў сэрцы працоўных памяць пра загінуўшых барацьбітоў за Кастрычнік!

Хозяйственное положение Белоруссии к 10-летию Октября.

(Статья заместителя председателя Совнаркома тов. Карклина).

Рука об руку с большинством крестьянства победоносно шагал вперед пролетариат Советского Союза, укрепляя в течение 10 лет существования советской власти диктатуру рабочего класса и союз рабочих и крестьян.

Бросая взгляд назад на пройденные 10 лет, мы можем теперь отчетливо видеть, как шел творческий процесс. Нет такого фронта, где бы не разрушалось старое, отжившее и не намечалось бы новое. Отдельные случаи маневрирования, отступления, не являлись следствием недочетов в нашей политике, а проводились в целях создания условий для еще более усиленного темпа наступления на старое и создания в дальнейшем нового, социалистического.

С каждым годом становятся более конкретными те лозунги, которые были выдвинуты в дни Октября, в дни свержения буржуазии и соглашателей. Если тогда нашими лозунгами являлись—за хлеб, за землю, за фабрики, то теперь эти-же лозунги звучат гораздо иначе. Теперь мы говорим: за хлеб—хлеб хороший, за промышленную продукцию в достаточном количестве, лучшего качества и дешевле. Не просто за землю, а за землю, дающую хороший урожай.

Первый этап нашей борьбы в период военного коммунизма можно характеризовать, как период закрепления революционных завоеваний вооруженным порядком. Период борьбы с разрухой, голодом, холодом, тифом, транспортными неурядицами падающей валюты—может быть охарактеризован, как второй этап закрепления революционных завоеваний, в котором пролетариат должен был доказать свою революционную зрелость и умение не только завоевывать власть, но и строить свое хозяйство. Теперь мы не только восстанавливаем, но и строим наше социалистическое хозяйство.

Мы не погибли под тяжестью, лежавшей на наших плечах, мы не хныкали и не падали духом, мы бодро справлялись со всеми трудностями.

Мы преодолели все величайшие трудности в условиях враждебного окружения нашей страны капиталистическими государствами, при наличии внутри нашей страны врагов, как чужестранцев, так и „доморощенных".

Мы победили экономическую разруху только благодаря тому, что в работе советской власти участвовали широкие массы рабочих и крестьян, чутко прислушивавшиеся к указаниям и призывам коммунистической партии. Только единый сплоченный коллектив трудящихся всего Советского Союза мог преодолеть все затруднения и препятствия, которые стояли на нашем пути в течение 10-ти лет. Только благодаря твердому единству можно было достигнуть тех успехов, которые мы теперь под'итоживаем накануне 10-го Красного Октября.

Идет рост населения БССР: 1924-1925 годы —4.764 тыс. едоков, 1926-27—5.010 тыс. едоков.

Наблюдается рост применения наемной рабочей силы: 1924-25 год дает рост до 192 тыс. человек. 1926-27 год—до 264 тыс. *Особенно отрадно то, что рост пролетарского ядра (производственные рабочие) идет более быстро*, чем рост наемного персонала вообще. Этот рост выражается в следующих цифрах: в 1924-25 г.—30 тыс., в 1926-27 г.—47 тысяч.

Следующий характерный показатель, рисующий наши достижения, это рост капитало-вложений в отраслях народного хозяйства, которые содействуют быстрейшему продвижению по пути социалистического строительства. Известно, что 1925-26 г. дал сравнительно большую цифру по вложению средств на восстановление народного хозяйства, а именно: 19.845 тыс. руб. (в довоенном исчислении). Этот год является решающим и переломным от восстановительного периода к периоду нового строительства. Следующие годы дают соответствующий рост вложений.

Этот рост денежных вложений в наше строительство в свою очередь создал благоприятные возможности для усиления товарооборота между городом и деревней, и усиления организующего влияния промышленности на сельское хозяйство.

Из года в год посевная площадь расширяется: в 1925-26 году она увеличилась на 8,5 проц., в 1926-27 году рост ее выразился еще на 4,4 проц., по сравнению с предыдущим годом. Одновременно идет и рост более доходных культур, которые требуются для промышленности, как—лен, картофель и т. п.

Такую же картину мы наблюдаем и в области животноводства.

Идет рост тех пород, которые дают *необходимое* для нашей промышленности сырье и идут для питания городского населения.

Для полноты картины следует привести участие

нашей кооперации. Влияние кооперации как в переработке продуктов сельского хозяйства, так и в кооперировании сбыта с каждым годом усиливается, а в соответствии с этим усиливается заинтересованность крестьянских масс в кооперативной работе.

Кооперация с каждым годом занимает все более значительное место в деле укрепления нашей политики в деревне и городе, т. е. в части усиления обобществленного труда в сельском хозяйстве и усиления снабжения промышленности сельскохозяйственным сырьем. Это видно из того, что посредническая деятельность кооперации по заготовке сырья для промышленности с каждым годом расширяется и крестьянство все с большим доверием относится к работе кооперации в этой области. Точно также все более усиливается роль как сельско-хозяйственной, так и потребительской кооперации по части заготовки продуктов для городов.

Данные о частном капитале в торговле говорят о том, что удельный вес последнего, несмотря на НЭП, давший возможность частному капиталу закрепиться на некоторых участках, все же неизменно падает.

Все приведенные данные со всей очевидностью подтверждают неуклонный рост нашего народного хозяйства, при чем важно отметить, что этот рост идет не по линии личного обогащения, а по линии большего укрепления социалистических элементов нашего народного хозяйства. Мы имеем непрерывное снижение групп бедняцких хозяйств, беспосевных и бесскотных хозяйств. Правда, при общем росте народного хозяйства, естественно должен быть некоторый рост и частно-капиталистических накоплений в целом, и в частности в верхушечной группе деревни (кулаков), но этот рост в относительных цифрах все время падает и не может затушевать того роста народного хозяйства, который мы имеем на лицо.

Этот рост и неуклонное развитие нашего хозяйства и социалистических элементов в нем, мог быть достигнут только благодаря энергичному проведению партией работы по улучшению благосостояния рабочих, бедняцких и середняцких групп деревни при одновременном поднятии производительности труда, проведении улучшенных мероприятий во всех отраслях народного хозяйства, усиленной индустриализации страны и интенсификации сельского хозяйства при одновременном росте культурного уровня всего населения.

Итоги и некоторые задачи.

Под'итоживая вкратце пути роста и укрепления нашего народного хозяйства, нельзя не остановиться на основных задачах, которые перед нами стоят на ближайший год и на тех трудностях, которые мы должны будем преодолеть.

Приходится еще раз подчеркнуть основные указания и директивы коммунистической партии по отдельным моментам нашей хозяйственной работы:

а) *Поднять производительность труда не менее чем на 12 проц.*

По промышленности:

б) *Снизить себестоимость по промышленности ВСНХБ на 5 проц.*

в) *Снизить отпускные цены на промтовары на 5 проц.*

г) *Добиться снижения стоимости строительства в конце года на 15 проц., особенно жилищного строительства.*

д) *В среднем снизить цены на мясные продукты на 5 проц.*

е) *Снизить розничные цены на 1,5+2 проц. с доведением до потребителя и 5 проц. снижения цен на промышленные товары.*

ж) *Усилить работу сельско-хозяйственной кооперации и кооперирование крестьянских хозяйств довести до 50 проц.; по потребительской до 55 проц.; и по центральной раб. кооперации кооперирование членов профсоюза—до 73 проц.*

з) *Снизить административно-управленческие расходы на 20 проц. не только по советским учреждениям, но и по предприятиям.*

л) *Провести самую суровую плановую дисциплину.*

Мы, активно осуществляя наши хозяйственные задачи, при широком участии самих рабочих, работниц и крестьян, крестьянок—создадим невозможность нападения на нас, и создадим прочную базу для будущих побед над капиталистическим миром *под единым знаменем мировой пролетарской революции, под единым руководством Коммунистического Интернационала, по заветам творца Октября—Ленина.*

„...Каждый рабочий и крестьянин, вся пролетарская общественность должны принять непосредственное участие в разрешении поставленных нами задач... Тогда мы достигнем величайших результатов, тогда мы быстро подвинемся по пути социализма, который начертал нам Октябрь...“

(Из речи В. Куйбышева на Юбилейной Сессии ЦВК СССР).

ВАСІЛЬ СТАШЭЎСКІ

(Член Усебеларускага аб'яднаньня поэтаў і пісьменьнікаў „Маладняк").

КАЦЯРЫНА

П'еска ў 2-х дзеях.

Асобы I дзеі.

1. ДЗЯНІС СУЧОК—селянін, высокі, малады.
2. КАЦЯРЫНА—яго жонка.
3. ДЗЕД ГАБРУСЬ—бацька Дзяніса.
4. I-я ЖАНЧЫНА.
5. II-я ЖАНЧЫНА.
6. ДЗЯЎЧЫНКА-ПАДРОСТАК.
7. МАКАРЫХА—бабка-шаптуха.
8. СЫМОН ЛАЦУГА—бедны шляхціц, стары кавалер, нізкарослы.

ДЗЕЯ I.

Адбываецца ў хаце Дзяніса, у дарэволюцыйны час. Старая хата, над вокнамі абразы. Курыць невялічкая газовачка. Ля печы, ці на лаве апрануўшыся сьпіць стары дзед Габрусь. З сумным, бледным тварам маладая Кацярына калыша сваё дзіцё і пяе песьню. Восень. Гудзе вецер.

Кацярына (*паціхеньку накрывае хусткаю калыску*). Сьпі, дзіцятка, няма твайго таткі. Трэці дзянёк ня бачаць яго нашы вочкі, а калі і пабачаць, дык мусіць заплачуць, бо няпэўна п'яным зьявіцца. Сьпі, сынок, а-а, а-а, люлі. Сьпі, расьці, можа калі заступішся за сваю мамку—крыўдзіць мяне твой татка.

(*Прачынаецца дзед Гарбусь*).

Дзед. А мусіць я доўга спаў?

Кацярына А ўжо даўгавата, дзедка.

Дзед. Што гэта, Дзяніса няма яшчэ выходзіць?

Кацярына. Няма, дзядзінька. Я ня ведаю, як будзе. Каб хоць дзіця было здарова, а то вельмі-ж галоўка гарыць яго, вось толькі цяпер крышку супакоілася, заснула. Мелася бабка Макарыха прыці пашаптаць, ды вось нешта няма.

Дзед. Трэба пайці каню закінуць, можа прыедзе сёньня. Эх, лайдак, лайдак. (*Пайшоў, адчыніў дзьверы, заўважыў нейкага ў сенцах*). Хто там? (*Бярэцца за качаргу*). Кажы хто, бо зараз качаргою агрэю. Маўчыць. Дай, Кацярына, сьвятло. (*Кацярына сьвеціць газоўкаю*).

Кацярына. Ды гэта-ж бабка Макарыха. Зайдзеце, бабунька, зайдзеце, залатая.

Дзед. Ідзі ў хату, чаго ты стала і маўчыш.

(*Бабка ўкацілася ў хату*).

Макарыха. Ой, родненькія, як я перапужалася, ой.

Дзед. Чаго?

Макарыха. Дак ты качаргу ўзяў у рукі, Габруська, а тут баюся і назад іці, і ў хату.

Дзед. Трэба было адазвацца, сказаць, што гэта ты.

Макарыха. Дак-жа няможна, родненькія, і слова сказаць, пакуль ня ўвойдзеш у хату, бо я шапчу скрозь ідучы і калі з кім загаворыш нават у сенцах, дак нядобра будзе.

Дзед Ага, ну гэта справа іншая, добра, што я не перарваў (*Пайшоў*).

Макарыха. Я, дзеткі, крыху запазьнілася, мелася раней прыйці і такі вышла, але я толькі на ганак, а кот—скок на парог. Я і вярнулася ў хату і чакала больш гадзіны. Можна было гадзіну, але як больш, то лепш. Ну, скажы, дзіцятка сьпіць?

Кацярына. Сьпіць, бабунька.

Макарыха. Гэта добра. Дай-жа мне, дзеткі, клубочак нітак.

Кацярына. Добра бабунька, але якіх—суравых ці кужэльных?

Макарыха. А, кужэльных, самых тоненькіх, беленькіх.

Кацярына (*дае невялічкі клубок*). Вось можа гэта будзе добры?

Макарыха. Нітачкі то падыходзяць, але лепш, дзеткі, каб большы.

Кацярына. Ёсьць у мяне, бабка, клубок, толькі яшчэ ня суканыя.

Макарыха. Клубок, гэта добра, дарма што ня суканыя.

Кацярына (*дае клубок*). Вось гэты, бабка.

(*Уваходзяць з прасьніцамі дзьве маладыя кабеціны і дзяўчынка-падростак*).

Усе. Добры вечар, Кацярынка.

Кацярына. Добры вечар. (*Дае знак, каб цішэй*).

Макарыха. Дай, галубка, ножык, што каля хлеба ляжыць. (*Кацярына дае, Макарыха адрэзвае*

нітку. Усе ўважна глядзяць). Злажы гэту нітку ў дзьве столкі і перарэж папалам. (*Кацярына так робіць, Макарыха бярэ па аднэй нітачцы, абарочваецца на ўсход, захад, поўнач, поўдзень і дзьме. Маладая дзяўчынка ўсьміхнулася, другая яе стрымоўвае*).

Макарыха (*да Кацярыны*). На табе гэтыя столачкі, перарэж на 3 часткі. (*Кацярына рэжа. Баба завязвае вузел і кладзе ў калыску пад галаву дзіцяці*).

І жанчына. Гэта ад чаго нагавор, бабка?

Макарыха. Гэта ад дванаццаці хвароб. У чалавека больш ня бывае, а калі прыкінецца трынаццатая, то ён памірае. (*Да Кацярыны*). Куды-б гэты вузельчык ні падкаціўся, ці пад бачок, ці пад плечкі, ці ў ножках будзе, ты яго ня чапай, ён будзе знаходзіць хворае месца. А я праз тры дні гэтаю парою прыду, а клубочак гэты трэба зьнесьці з хаты.

Кацярына (*дае клубок*). Вазьмеце, бабка. (*Дае другі*). Вазьмеце. (*Баба бярэ клубкі і пайшла*).

ІІ жанчына. Яна і трэці клубок узяла-б, каб ты падсунула ёй.

Кацярына. Ну, што-ж зробіш, сястрыца, можа і лепш, каб які фэльчар паглядзеў, але-ж таксама трэба за лякарства плаціць. Сядайце-ж.

(*Усе садзяцца, пачынаюць прасьці*).

І жанчына. Не, гэта бабка такі знаецца на хваробах, не паехалі-б людзі з-за сьвету, каб не памагала.

ІІ жанчына. А гэтыя бабкі часам і зводзяць са сьвету людзей. Вунь Паўліна радзіць мелася, дык гэтыя бабкі не дазволілі ёй легчы, а стаяць яна не магла, так дужа жывот балеў, дак яе трапкачамі і вяроўкаю падвязалі пад пахі, ды за траму падвесілі. Счарнела бедная. Пачалі ўжо падтрымоўваць, а потым бачаць, што яна пачынае зубы сашчапляць, дык зьнялі. А радзіла, дак пачалі зельлем нейкім падкурваць, дальбог, чуць не ўчадзела.

Кацярына. Ну, я хто-ж гэта ведае, як трэба лепш рабіць.

ІІ жанчына. Не, хацела-б, каб хоць адзін мужчына з нашае вёскі радзіў, няхай-бы паспытаў, які гэта смак, а то і мой, як я Юрачкам хадзіла,— памагай яму мяшкі скідаць, насі бульбу кошыкамі з пограба. Перш слухала, а потым кажу: насі сам.

Кацярына. Добра, што ты сказэла і нічога, а каб-жа я так зрабіла, дак па зубох і зарабіла-б.

І жанчына. Яны толькі як сватаюцца, дак добранькія.

ІІ жанчына. Ну, табе то няма чаго наракаць на свайго чалавека—ціхі, спакойны.

І жанчына. Дак затое сьвякроў не дае жыць, а ён маўчыць.

Кацярына. Ах, сястрыцы мае! Усіх нас, жанчын, доля нейкая нялюдзкая. Адну сілком замуж аддадуць, прымусяць слаць пасьцель нялюбаму, другую—сям'я чужая заядае, трэцюю—муж грызе, і жывеш, як авечка сярод ваўкоў. Толькі і знай, што ўлетку з цямна да цямна на полі цалюткі дзень, ды яшчэ з дзецьмі, а ўзімку за кудзеляю сушы свае грудзі.

І жанчына. Ня кожная жанчына сушыць свае грудзі. Пані Краскінская, валяючыся ў пуховых пярынах ды ў мягкіх крэслах, ня высушыць. Вось бо дальбог падла. Панесла гэта я з Ганнаю Якубчыкавых да яе сноп зажынальны, прайшлі гэтак нешта баковак можа з восем. І вось вуглавы пакой: вялізныя люстэркі, каб разьбіў на кавалкі хоць адно, то дальбог хапіла-б усім нашым дзяўчатам па кавалку. Дак сядзіць гэта яна ў крэслах.

ІІ жанчына. Ты кажаш—у крэслах, як гэта яна села ў некалькі крэслах?

І жанчына. Як села? Ліха яе ведае, як яна, але на адным сама сядзела, на другое ногі палажыла, а трэцяе нейк дуба сьпіну ёй падпірала.

(*Усе засьмяяліся*).

І жанчына. А пад нагамі прыгожыя, прыгожыя дываны разасланы і на іх парасьцягваліся каты і сабакі, каб яны падохлі.

ІІ жанчына. Дак вось адзін яе кот здох, ці можа хто прыдушыў, адным словам, згінуў і знайшлі за сьвірнам, дак яна чуць не звар'яцела, а колькі выплакала. Дак вось, у іх, паноў, таксама гора вялікае бывае, галубка мая.

І жанчына. Такое-ж гора ў іх і бывае.

Кацярына. Не, сястрыца. Як вы сабе не кажэце, а нейк нядобра на сьвеце зроблена; ня будзем казаць аб тым, як нейкая там пані вар'яцее, няхай сабе вар'яцее, але чаму мы такія няшчасныя? Калі ўжо мы напаткаем сваю лепшую долю?

(*Расчыняюцца дзьверы, уваходзіць п'яны Дзяніс, за ім знаёмы Дзяніса Сымон Лацуга, зусім п'яны і ззаду зачыняе дзьверы дзед Габрусь*).

ІІ жанчына. Ну, вось спатыкай сваю долю, прыпаўзла.

Дзяніс. А, в-вячоррачкі ў нас, добра. (*Да Лацугі*). Добра, Сымон?

Лацуга. Ік, добры вечар. (*Усе ўсьміхнуліся, дзяўчынка-падростак больш за ўсіх*).

Дзяніс. Разьдзявайся, Сымоне, ды глянь—вось гэтыя дзьве кабеціны і (*паказвае на падростка*) гэты маленькі пупішачак могуць даць табе поўнае ўяўленьне хараства дзяўчат нашае вёскі і асабліва ракамандаванае мною вам Марылі Цыбульчык.

І жанчына. Ды я зусім і ня з вашае вёскі.

Дзяніс. Ну, а ты (*ушчыпнуў*) маўчы. (*Да Лацугі*). Ну, разьдзявайся, пане Сымоне. (*Разьдзяваюцца*).

Лацуга. Сьлічне дз-дзінькую, сьліч-ік не.

ІІ жанчына. Во, як сьлічне.

(*Усе, апрача Кацярыны, пырснулі ад сьмеху*).

Што гэта, можа гэты пан у сваты да Марылі Цыбульчыхавай мерыцца.

Дзяніс. А, вось, вось, сваю гаспадарку мае. Ракамандую: Сымон Лацуга.

Дзед. Гэта што за валацуга?

Дзяніс. Э, э, бацька, Сымон Лацуга, Ла.

Лацуга. Ла

Дзяніс. Цу

Лацуга. Цу

Дзяніс Га

Лацуга Га. Так, пане. І нават праўдзівей не Лацуга, а Лацугá.

Дзед. Уга! Яшчэ як. Усё адно валацуга і больш нічога.

Дзяніс. Ну, Кацярына, прыняць госьця.

Кацярына. Чым? Што ў нас ёсьць?

Дзяніс. Но, но, ты ня фіглюй (*падыходзіць да яе*). Сьпячы сала і зьбегай за квартаю, пазыч хоць дзе небудзь.

Кацярына. Ну, куды я пайду, гэтаю цемрою і навошта гэта?

Дзяніс. Но, но, сказана! (*Да Лацугі*). Гасьцілі ў цябе, зараз пагосьцім у мяне.

Лацуга. Э, дзінькую сьлічне, можа турбацыя якая ў гаспадарсьцьве...

Дзяніс. Жаднае турбацыі.

Дзед. Які спрытны, чаму гэта жаднае турбацыі?

Дзяніс. Но, ты, бацька, маўчы з сваёю песьняю.

Дзед. Як гэта маўчы, ты будзеш цягацца з валацугамі, а нам маўчаць.

Дзяніс. Бацька!.. (*Да Кацярыны*). Чаму ня йдзеш, га?

Кацярына. Не пайду за гарэлкаю, хопіць ужо і гэтага.

Дзяніс (*скрыўлена*). Ня пойдзеш, у, ты. (*Піхануў яе. Дзед палкаю па сьпіне Дзяніса*).

Дзяніс (*павярнуўся*). Што гэта?

Дзед (*паказвае на Кацярыну*). А гэта што? Чаму ты піхаеш яе?

Дзяніс (*як звар'яцеўшы*). Хто муж яе, ты ці я, хто вас хлебам корміць?!

Дзед. Дзіця хворае, вар'яты.

Дзяніс (*бегае па хаце*). Хто гаспадар у хаце?! (*Жанчыны, апрача Кацярыны, уцякаюць з хаты*). Халера-б вас падушыла.

Лацуга (*да Дзяніса*). Пане Дзяніс, пане Дзяніс.

Дзяніс. Я навяду парадкі.

Кацярына. Не, галубчык, або жыць ня буду, або я навяду парадкі.

ЗАСЛОНА.

Мэліарыруюць балота.

ДЗЕЯ II.

Асобы II дзеі.

(*Мужчын 3, жанчын ад 5 да 10*).

1. КАЦЯРЫНА—член сельсавету.
2. ДЗЯНІС—яе муж.
3. АНТОСЬ—член сельсавету.
4. МЭЛІЯРАТАР.
5. ТЭКЛЯ
6. АГАТА } пажылыя жанчыны.
7. ДЗЯЎЧАТЫ—вучацца ў лікпункце.

Адбываецца таксама ў хаце Дзяніса. Час 1926-27 году. Хата мае іншы, лепшы выгляд. Кідаецца ў вочы адсутнасьць абразоў. Вісяць партрэты: Леніна і Клары Цэткін. За сталом сядзяць: Кацярына, Антось Заяц і Мэліяратар. (*Кацярына і Антось—члены сельсавету*). Дзяніс крыху збоку разглядае часопіс „Работніца і Сялянка".

Антось. Вось я і кажу, калі мы на сходзе паднялі пытаньне аб тым, што трэба ўзяцца за асушку балота, дак нас на сьмех узялі, асабліва яе, Кацярыну, як галоўную дакладчыцу па гэтаму пытаньню. Я, прызнацца вам, таварыш, не хацеў ужо і паднімаць гэтае пытаньне, але яна (*паказвае на Кацярыну*) рупна ўзялася.

Кацярына. Крычаць, ведаеце: век яно стаіць гэта балота, век яно стаяць будзе. Капанулі крыху ды ўжо кідаць.

Антось. Дак яна ўзяла лапату, сабрала баб ды пайшлі капаць, вось тады нейк разварушыліся.

Кацярына. Лаяліся страшэнна.

Антось. А цяпер дак хваляцца перад другімі вёскамі: во, кажуць, як трэба рабіць.

Мэліяратар. Так, вы прарабілі надзвычайна вялікую работу. Вам удалося раскачаць сялян. Пачатак вельмі добры. Векавое балота не стаіць, як кажуць, яно зрушана з месца.

Антось. Канава так увачавідкі пацягнула вадзіцу.

Мэліяратар. Так, але-ж засталося яшчэ многа работы. Пастарайцеся за зіму канчаткова злажыць таварыства, а Наркамзем пойдзе на спатканьне.

Кацярына. Мы тут пастараемся, глядзеце-ж вы там у цэнтры, каб падтрымалі, а то мы вам задамо перцу, як прыедзем на зьезд.

Антось (*задаволена*). Вось як у нас.

Мэліяратар. Правільна. Гэта добра. Больш-бы такіх жанчын.

Кацярына. Пачакайце. Гэта пакуль няпісьменнасьць у нас страшэнная сярод жанчын, а вось ліквідуем яе, тады голас наш стане мацнейшым.

(*Уваходзіць Тэкля*).

Тэкля. Добры вечар. Я да цябе, Дзянісіха. Гэта дзяўчынка мая з вочкамі мучыцца. Бабка Макарыха і шаптала, і ваду давала мазаць, а яны ўсё чырвоныя і баляць, дак ня ведаю, што рабіць.

Кацярына. Кіньце вы, цётка, гэту бабку, яна налечыць. Вось наказаньне яшчэ з гэтаю шаптухаю. Абяцала, што ня будзе займацца

— Добра, сястрыца, добра...

больш шэптамі, дак не такі, ня можа ўтрымацца, але-ж і самі вінаваты. Вось што, цётка, заўтра у нас, здаецца, нядзеля.

Тэкля. А так, нядзелька, галубка.

Кацярына (*піша запіску*). Я табе дам запіску, паедзеш у бальніцу, няхай там доктар агледзіць.

Тэкля. Ці прыме ён бяз грошай?

Антось. Прыме, толькі лепш раней выехаць, бо там у нядзелю вялікі наплыў хворых, асабліва цяпер з восені.

Кацярына (*да Антося*). На, прылажы пячатку. (*Антось прыкладвае*). Вось табе гэту запіску і абавязкова завязі дзяўчынку, а да бабкі Макарыхі глядзі, каб не зварачалася.

Тэкля. Добра, дзякую, галубка мая, дай божа табе здароўя. (*Ідзе да дзьвярэй, у хату ўваходзіць суседка яе, Агата*).

Агата. А, паскардзіцца прышла, выдра ты!

Тэкля. Сама ты выдра, чаго я буду скардзіцца.

Агата (*дразнячы*). С-сама выдра.

Тэкля. Чаго ты выскалілася?

Агата. Бачыш ты, пабегла скарэй пажаліцца да Кацярыны. Вось пабачым, чыя будзе праўда, твая ці мая.

Тэкля. Ёлапацень ты дурны.

Кацярына. Чаго вы там задзіраецеся. Цётка Агата, у чым справа?

Агата. У яе прапаў кужэльны пачынак з коміну, а там змрокам дзяўчаткі гулялі ў курмышку, можа дзе скінулі, ці закінуўся, а можа яе дзяўча занесла на цукеркі, дак яна, выдра гэта, на маю дзяўчынку склала віну, што быццам...

Антось. Пакінь ты плявузгаць, Агата, нічога яна пра гэта не казала.

Кацярына. Яна узяла пасьведчаньне ў бальніцу і ўсё.

Агата. Хіба так, бо я думала, можа яна нагаварыла.

Антось. Нічога яна не гаварыла, ідзі спакойна сьпі. (*Адыходзіць*).

Тэкля. А што,—а ты вызьвярылася.

Агата. Бо няма чаго чутак распушчаць... (*Пайшлі*).

Антось (*да мэліяратара*). Знаеце, таварыш, мы шчасьлівы, што маем у сельсавеце жанчыну, усе гэтыя жаночыя сваркі разьбірае яна, і ня думайце, тут справа ня лёгкая, тут трэба добра ведаць політыку, як з імі, значыць, абыйсьціся. І ня толькі гэта. Яна і лікпункт заснавала, як ужо бачылі, мэліярацыю гэту...

(*З двара чуваць: тпру*).

Мэліяратар (*устаў*). Так, дарагія таварышы, работы ў вас ня мала, цяжкавата, але год за

годам агульная сьвядомасьць наша расьце, праца пашыраецца і гэта дае нам упэўненасьць, што жыцьцё наша мы перабудуем. Рад пагутарыць з вамі, але, здаецца, фурманка пад'ехала. Бывайце здаровенькі, пажадаю вам далейшае пасьпешнае працы. (*Разьвітваецца і адыходзіць*).

Кацярына. Ну, трэба-ж іці ў пограб прынесьці бульбы на заўтра. (*Бярэ кошык і пайшла; Дзяніс ходзіць па хаце, задумаўшыся*).

Антось (*пакашлівае, паглядае на партрэты і на Дзяніса*). Што задумаўся, Дзяніс?

Дзяніс. Ні то, каб задумаўся, а так нейк...

Антось. Маладчына твая гэта жанчына.

Дзяніс. Дак вось, браце, я і сам цяпер бачу. І вось нейк нялоўка. Вы тут гаварылі, а я сядзеў, слухаў і ў мяне ўваскросьлі мінулыя гады.

Антось. Ага, цікава.

Дзяніс. Як сам ты ведаеш, ажанілі мяне маладым, пажыў крыху і пачаў, як цяпер кажуць, бузіць. Бывала, што і калаціў Кацярыну.

Антось. Ну, дык што, шкадуеш, што цяпер няма як пакалаціць?

Дзяніс. Ды не, браце, шкадую, што дурны быў. А вось забралі мяне на вайну, думаў, што загіне ўсё тут. А яна адна ды з дваімі дзеткамі працавала, сумела затрымаць сёе-тое ў гаспадарцы. Быў крыху я і ў Чырвонай арміі, яна таксама адна ўпраўлялася на гаспадарцы. Зажыла яна гора. Усяк бывала і мне. Зьмянілася жыцьцё, зьмяніўся і я, характарам зьмяніўся, і калі ўспомню пра даўнейшае сваё глупства, дак сорамна робіцца. І вось я думаю, што можа не адна такая Кацярына знайшлася-б, каб разьвязаць яе крышку, у сям'і нейк трэба разьвязаць, бо ў правох рэволюцыяй яна разьвязана.

(*Уваходзіць Кацярына з кошыкам бульбы*).

Кацярына. Ведаеш што, Антоська, трэба хутчэй перарабіць печку ў клясе, бо нельга там уседзець. Покуль восень, яшчэ сяк-так, а ўзімку памерзнуць ня толькі дзеці, а і лікпункт наш.

Антось. Ага, трэ' будзе заўтра пагаварыць там.

Кацярына. Паедзем заўтра, Дзяніска, у мястэчка.

Дзяніс. Добра. (*Чуцен дружны сьпеў дзяўчат*). Чакайце, дзе гэта сьпяваюць? (*Прыслухоўваюцца*).

Антось. Дзяўчаты сьпяваюць. Бачыш як зацягнулі, ніштo сабе.

Дзяніс. Ага, добра.

Антось. Гэта мусіць Алеська такім празрыстым вядзе. О, сюды ідуць.

Кацярына. А, гэта яны з лікпункту ідуць дадому, так, так. (*Расыняюцца дзьверы і дзяўчаты ўвальваюцца з песьняю ў хату. У іх у руках буквары, сшыткі*).

1-я дзяўч. Паглядзі, Кацярынка, як я пішу. (*Паказвае сшытак*).

Усе (*паказваюць свае сшыткі*). Паглядзі, як я, як я... (*Антось і Дзяніс сьмяюцца*).

Кацярына. Добра, сястрыцы, добра

2-ая дзяўч. А Волька, дак малюе добра, усім нам па кавалеру намалявала. (*Усе сьмяюцца*).

3-яя дзяўч. Ага, твой-жа, Кацярынка, партрэт у часопісу „Работніца і Сялянка".

Усе. Ага, ага, мы адразу пазналі.

1-ая дзяўч. Вось, здаецца, каб нас там намалявалі.

Кацярына. Бучэцеся, як скончыце лікпункт, напішаце туды свае пісьмы, будзеце працаваць...

Усе (*не далі дасказаць*). Ур-ра! Кацярыну на вура. (*Падымаюць на вура*).

КАНЕЦ.

Воспоминание.

Время страшное мы пережили—
Революцию, голод и мор,
И с гражданской войной порешили
За то воля теперь и простор.
Эх! и время паскудное,
Словно вихрем его пронесло,
Как под прессом оно нас давило
И не мало в могилу легло.
Что у нас тогда только творилось,
То и дело газетчик кричит:
Там с Деникиным красные бились,
Здесь Колчак с своей сворой бежит.
Шла борьба и в тылу, и на фронте,
Все боролись, как только кто мог,
За то вера пропала в иконы,
Где-ж ты был и что делал ты бог?
Кто умней спекулировал богом—
На муку, на картошку спускал,
На икону-ж крестились с порога,
Чтоб мужик охотнее менял.
А чего только не было с солью,
Не сумею всего—рассказать,
Вспоминается все теперь с болью,
А тогда, что ни есть, все подстать,
И курьезов достаточно было,
Вспоминаешь—и горе, и смех,
И не малую роль в нашей жизни
Исполнял старый, латаный мех.
Но промчалася буря стихийная,
Старый строй словно вихрем снесло,
И хорошее времячко мирное,
Пышным цветом для нас расцвело.
Где не идешь—везде веселье,
Слышышь музыку, песни и смех,
Жизнь пошла новой колеей
И творит небывалый успех.

С. Тюфеева
(Жена рабочего, Гом. ок.)





В эти три с'ездовских дня совсем другой
узнаваемой, жизнью клокотал лучший Мин
клуб им. Карла Маркса.

Эта деловая жизнь клуба начиналась ра
утром и затихала далеко вечером.

Молодые и старые крестьянки, пожилые р
ницы собрались в этом клубе обсуждать
большие дела.

К с'езду готовились.

Светлое и просторное фойэ клуба сп
занято выставкой. Эти выставки открыли с
целью, чтобы показать делегаткам, как надо
вильно жить самой, правильно воспитывать
детей.

В уголке санитарного просвещения вечно
пилась группа. Оживленно перебрасывались
ниями. Уголок привлекал богатством матер

Чуть подальше от него была открыта др
выставка. В ней собраны экспонаты малее
детишек. Выставка отражала их жизнь, их ра
Вот маленький огородик, выращенный св
силами, картинки, написанные самими детиш
и много других интересных материалов

Утром до начала работы с'езда у выс
всегда переполнено. Делегатки еще и еще о
ривают экспонаты, списывают нужные цифры
вот из глубины залы тонкими голосами п
тился звонок.

Спешат занять свои места, бегло просм
вают свежие газеты.

Деловой с'ездовский день начался.

За три таких дня делегатки успели оз
миться с рядом чрезвычайно важных вопр

Предсовнаркома нашей Республики т. Го
прочел с'езду доклад на тему о внешней и
тренней жизни Советского Союза.

Доклад, конечно, привлек все внимание
гаток.

БОЛЬШИЕ ДЕЛА.

(Три дня на Минском с'езде).

Тяжелые дни переживает Республика. Внешних врагов много. И делегатки с'езда, точно дипломаты, записывают в блок-нотики слова Предсовнаркома, подчеркивают их, а потом выступают со своими мнениями.

Каждый доклад широко обсуждали делегатки. Но особенно их активность проявилась по первому докладу.

Одна за другой выходили они на трибуну. Просто, но горячо высказывали свои думы.

Крестьянка *Якоби*, прежде чем охарактеризовать доклад т. Голодеда, передала делегаткам свои первые впечатления от с'езда.

Тов. Якоби не оратор. Она может быть первый раз выступает в такой обстановке. Тем ценнее и дороже ее слова.

Где это видано—говорит тов. Якоби—чтобы я, простая селянка, с глазу на глаз разговаривала со своим правительством. 40 лет живу. И вот только в эти дни удалось мне испытать такое счастье.

Высказывались по докладу тов. Голодеда и работницы. Они отмечали свою полную готовность стать на оборону Республики.

Пусть только грянет зов.

Практически и деловито с'езд обсудил еще два большие вопроса—наши медицинские да обучальные дела.

Первый медицинский вопрос вызвал много справедливых толков. Нехватает в деревне акушерок, потом врачи не близки к массам. Об акушерках на с'езде говорилось много, чуть ли не столько, как о заклятом враге Чемберлене.

Правда, акушерки не враги, наоборот, они друзья. Но хороши друзья когда их хватает, а некогда мало. Тогда на сцену выплывают грязные бабки, глупые знахарки, а вреда они приносят, конечно, не меньше чем „Чемберлен".

Когда список желающих высказаться по „медицинскому докладу" иссяк—слушали следующ очередной доклад Окр. ОНО.

Тут на сцену всплыли холодные школы, не организованные „сенатории" для учеников (устают за зиму детки), потом много говорили о ликпункте. Больно мало их организовано.

С'езд бесконечно приветствовали. Делегатки подносили Президиуму дорогие подарки. Пуховичские крестьянки в свободную минуту вышили белорусский пояс и сейчас подарили его Президиуму в память о с'езде.

В последний день с'ездовской работы делегатки дружно избрали 8 лучших товарищей на Всесоюзный с'езд, с под'емом спели „Интернационал" и в красивом клубе им. Карла Маркса" снова потекла обыденная, будничная жизнь. делегатки раз'ехались по районам для продолжения и углубления творческой работы.

Е. Садовский.

Между 2 и 10 октября проходили по всей Белоруссии окружные с'езды работниц и крестьянок-общественниц.

На наших фотографиях—делегатки Минского окружного с'езда. На второй фотогр. (вправо) зав. окрженотделом т. Гуминская среди делегаток с'езда.

Октябрь.

Лишь десять годочков минуло
Советской страны, Октябрю,
Как волей свободой подуло
Буржуям всех стран на беду.
Лишь десять годочков... а сколько
Уже натворил он чудес,
Как сильным размахом и бойким
Срубил заколдованный лес.
Столетья во мраке блуждали,
Народы забитой страны,
С надеждой спасения ждали
Во власти насилья—рабы.

Вдруг красной звездою скатился
На землю Октябрь Трудовой,
В агонии враг наш забился
Под властной рабочей рукой.
Он юный, но крепко, как воин,
Стоит у Труда на часах,
И скоро врагу—капиталу
Напомнит о старых долгах.
Настанет минута и тучей
Он грянет стихийной всемирной грозой,
Подымется ратью могучей
В последний решительный бой.

К VI С'езду профсоюзов Белоруссии.

Созываемый 27 октября Всебелорусский с'езд профсоюзов подведет итоги, как по всем областям союзной работы, так и по работе среди работниц. В ряду с общим укреплением всей союзной работы, имеются достижения и здесь. Увеличилось число женщин в составе союзов: На 1 октября 1925 г. было 31.148, а на 1 октября 1927 г. 53.105.

Увеличилось внедрение женского труда в производстве: на 1/IV-25 г. было в промышленности ВСНХ 2868 работниц, на 1/I-27 г —5399. Улучшилось материальное положение, а в связи с этим несколько поднялся и культурный уровень работниц. Благодаря этому имеется также и общий рост активности работниц в участии их в союзной и общественной работе.

Но все же нужно сказать, что достижения далеко недостаточны. Рост выдвижения на руководящую работу и вовлечение в выборные органы работниц идет еще очень медленно. Процент работниц вовлеченных в ФЗМК остается таким же с 1927 г. по сравнению с 1926 г. (16,7 проц.) В составе ЦП и окротделений процент работниц снизился с 17,9 проц. до 17,7 проц. в составе ЦСПСБ и ОСПС процент вовлечения также снизился с 12 до 10,8 проц. Все эти цифры говорят о том, что участие женщин членов союзов в работе профорганизации в лучшем случае стабилизируется и в некоторых местах имеет тенденцию понижения.

Значительно хуже обстоит дело с выдвижением работниц на руководящую административно-хозяйственную работу.

Не совсем благополучно обстоит дело и с поднятием квалификации работниц. Тут мы встречаемся с двумя препятствиями, во-первых, нежеланием некоторых хозяйственников итти навстречу поднятию квалификации работниц, ибо это связано с расходами и из-за боязни вытеснения мужского труда и, во вторых, в отдельных случаях имеется наличие фактов отказа от поднятия своей квалификации самих работниц из-за боязни снижения на первое время заработка и недооценки своих способностей.

Благодаря низкой квалификации работниц заработная плата их значительно отстает от зарплаты рабочих, даже в тех отраслях промышленности, где преобладает женский труд, или где он применяется в значительной мере. По союзу текстильщиков из 4339 членов союза работниц 2803 или 64 проц. средний тарифный разряд рабочего 6, а работницы 4. Или по союзу химиков: члены союза работницы составляют 40 проц., средний разряд рабочего 6, а работницы 3,5. Это доказывает, что работницы работают преимущественно на подсобных неквалифицированных работах. Вопрос о поднятии квалификации работниц в настоящее время, в связи с угрозой войны, приобретает особо важное значение, ибо в случае войны работница должна будет занять в производстве место квалифицированных рабочих, чтобы обеспечить бесперебойную работу наших фабрик и заводов.

Поднятие квалификации работниц и продвижение их на более квалифицированную работу должно стать одной из основных работ союзов на ближайший период.

К десятилетию Октябрьской революции мы не выполнили задачу поставленную тов. Лениным в части полной ликвидации неграмотности, это в большей мере касается организованных в профсоюзы работниц, где насчитывается их неграмотных 3516 чел., не говоря уже о большом количестве малограмотных.

Имеется рост вовлечения женщин в клубную работу, все же приходится сказать, что клубы в своей работе не полностью отражают интересы и запросы женщин, как более отсталой части организованного пролетариата.

Очередной VI-ой С'езд профсоюзов в своей работе должен остановить свое внимание на всех вопросах работы среди работниц и дать директивы на дальнейший период работы. Е. С.

Работница, квалифицируйся, поднимай свою грамотность: этим ты закрепишь свои завоевания в Октябре.

У 10-ую гадавіну Кастрычніка—працоўныя жанчыны БССР шлюць гарачае прывітаньне замежным работніцам і сялянкам!

Дарагія сёстры з Савецкай Беларусі!

У дзень дзесятай гадавіны Кастрычніка прымеце прывітаньне ад работніц-тэкстыльшчыц Хэнаіхэна. Ваша сьвята — сьвята пролетарыяту ўсіх краін. Ваша краіна—маяк прыгнечаных падняволеных народаў.

Калі я ня была ў вашай краіне, я мела аб ёй сумныя веды. Я не разумела і не магла ніяк уразумець што-ж даў Вам Кастрычнік. Вось і ў нас рэспубліка таксама, чаму-ж гэта толькі ў нас неяк са злосьцю глядзелі, дый глядзяць на Ваш Саюз. Я была рада, калі мяне абабралі ў дэлегацыю, якая ехала ў СССР.

І калі я пабыла ў Менску толькі два дні, я ўбачыла розьніцу паміж нашай рэспублікай і СССР. У Вас ужо ў Менску я ўбачыла, што рабочы ў Вас сапраўдны валадар свайго жыцьця... Потым я разам з дэлегацыяй аб'ехала СССР, пабыла на фабрыках, у дзіцячых ясьлях, дамох, санаторыях і г. д. Усюды я ўбачыла, што Ваш Кастрычнік даў уладу ў рукі саміх рабочых, а не „дэмократычным правадыром". Я ўбачыла, як любяць у Вас Леніна, як паважаюць другіх правадыроў. Ня так, як у нас.

І калі я зьвярнулася дадому, я стала выконваць сваё абяцаньне, якое дала рабочым і работніцам Савецкага Саюзу — расказваць праўду пра Вашу краіну. Што зрабіла я ў гэтым напрамку? Я перадала свае ўражаньні аб Сав. Саюзе на сходах рабочых ня толькі Хэнаіхэна, Бад-Шляха, Габлонца, але і ў другіх гарадох Чэхаславакіі.

Нас было дзьве работніцы, і ад нас, галоўным чынам, патрабавалі высьвятленьня жыцьця жанчын у СССР. *Каля 200 дакладаў зрабіла я за ўвесь час.* Акрамя гэтага на розных сходах, у прыватных гутарках, я расказала аб усім, што бачыла ў Вашай краіне.

Кожны новы год існаваньня Савецкага Саюзу ўзмацняе рабочы рух ува ўсіх краінах, набліжае час сусьветнага Кастрычніка. Мы, жанчыны-работніцы, будзем рыхтавацца і ўжо рыхтуемся, каб прыняць удзел у будучых бойках за сусьветны Кастрычнік.

Сёньня мы вітаем Вас, сёстры з Савецкай Беларусі, з дзесяцігодзьдзем існаваньня Савецкае Краіны—крэпасьці пролетарыяту.

Мы кажам Вам у гэты час: *Мы заўсёды з Вамі і мы разам з Вамі будзем бараніць нашу бацькаўшчыну—СССР.*

Няхай цьвіце, расьце і мацнее Савецкі Саюз.

Анна Боўда.

(Сябра дэлегацыі Чэхаславацкіх рабочых, пабываўшай у СССР).

Мы на страже.

(Письмо работниц—красных фронтовиков, получено на языке эсперанто).

Вы празднуете 10-ти летие Октябрьской Революции в момент, когда грозные тучи военной опасности нависли над миром. Вы празднуете 10-ти летие Октября в дни лихорадочной подготовки буржуазии для новых боев. Накалённая атмосфера вот вот может разразиться войной. Буржуазия хочет этой войны, она точит давно свои зубы на пролетариат, защитником которого является Советский Союз.

Буржуазия хочет войны, ибо она хочет получить от нее новые завоевания, новую прибыль. Но в то же время она не уверена в рабочих отрядах, которые должны будут пойти в бой.

С фашистскими отрядами и королевской гвардией не очень то повоюешь. Мы, германские Лейпцигские работницы—члены союза Красных фронтовиков, в день 10-й годовщины Октября заявляем Вам работницы и крестьянки Советского Союза, что *мы будем всегда стоять на страже—Советского Союза.*

Наш поднятый сжатый кулак—это наш ответ буржуазии. Этот кулак, когда будет нужно, сможет разбить капиталистический класс.

Да здравствует Великая Октябрьская Революция!

Да здравствует мировой Октябрь!

По поручению: **Фрида Бесслер, Гильма Думке, Эльза Сопнэр.**

Лейпциг (Германия).

Будем бороться за Октябрь в Польше.

Мы, работницы-эсперантистки, Лодзинских фабрик шлем работницам и крестьянкам соседней Советской Белоруссии—свой привет в день 10-й годовщины Октябрьской революции.

Десять лет как рабочий класс великого Советского Союза строит свободно свою жизнь. *У нас до сих пор еще царит полная эксплоатация рабочего класса. Лодзинские тюрьмы полны рабочими.* Сотни безработных голодают. Зоркое око охранки следует за нами. Но мы клянемся Вам не оставить нашей борьбы. Путь вашего Октября—наш путь, мы пойдем по нем.

Как бы не тяжела была борьба, мы будем бороться. Да здравствует Октябрь! Да здравствует Советская Польша, за которую мы будем бороться!

Работницы-эсперантистки Лодзинских фабрик.

9 октября через Минск проехала делегация немецких работниц на Всесоюзный с'езд работниц и крестьянок. Проехало 6 делегаток, а две были задержаны при проезде через Польшу.

Встреча делегации работниц из Германии.

Тихо подкатил поезд. К какому вагону итти?

Потянуло, как будто узнали, что здесь сидят.

— У-р-р-а!! советская территория у-р-р-а—искрой вырывается из глубины души делегатки. Обнимаемся, хотя ничего еще друг другу не сказали.

Уже отвыкли. На вокзале, а без конвоиров. Нас до Польши немецкие полицейские, а из Польши—польская жандармерия не покидала. Никого к нам не допускали, будто преступники.

Уложив их вещи в вагоне, незаметно входим в вокзал. Интернационал, затянутый ими, подхватывается всей присутствующей публикой, задерживает на время наши расспросы и еще раз подтверждаем им, что они на советской территории.

Никто не давал слова. Нет председателя, а работница уже говорит.

— Есть трудности в нашем большом строительстве—говорит тов. Танаевцева—Зам. Зав. Женотделом ЦК КПБ, приехавшая встречать делегацию, но за то мы строим социализм нашими мозолистыми руками, руками рабочих и крестьян.

— Да здравствует СССР, да здравствует рабоче-крестьянское правительство, да здравствует единственная в мире пролетарская республика, да здраствует союз рабочих СССР и Германии, да здравствует 3-й Коммунистический Интернационал—доносятся в ответ со стороны германской работницы тов. Кнопп.

Тов. Ганне—председатель делегации.—Мы приехали посмотреть Ваши достижения, изучить Вашу работу, побывать на фабриках и заводах, ознакомиться с условиями работы всего рабочего класса и в первую очередь работниц. О таких учреждениях, как ясли, детские сады, площадки специально для детей работниц, мы в наших условиях еще не смели мечтать. В нашей стране вместо этого мы имеем аресты, когда выявляем симпатии вашей стране и когда начинаем действовать в том направлении, чтобы у нас осуществить власть советов. Для нас Советская страна это школа, где мы должны пройти курс того, как нам бороться против капитализма. Мы обо всем, что здесь изучим передадим с точностью нашему пролетариату.

Время отхода поезда. Усаживаемся в вагоны. По дороге мы узнаем, что получили они разрешение побывать в СССР три недели, помогли им в поездке текстильщики. Собрали они на поездку 30 рублей и на эти деньги двинулись. С большим изумлением они ознакамливаются с повесткой дня с'ездов работниц и крестьянок, говорят, что о таких вопросах государственного управления с ними, германскими работницами, в их государстве не говорят.

В 3-м часу ночи приехали в Минск. На вокзале встречает Окружной с'езд работниц и крестьянок и работницы и жены рабочих города.

Забросали их цветами, протягиваются руки братской солидарности.

Поезд тронулся.

Г. Э.

О женщине.

С. Тюфеева.

Долго страдала в неволе ты, женщина,
Много ты слез пролила,
Долго под гнетом слепых предрассудков
Ты угнетенной была.
Долго ты счастья не знала, болезная,
Жизнь твоя была тяжелой борьбой,
Часто преграды встречала железные,
Долго покорной была ты рабой.
Полно! Не будешь ты больше рабою,
Путь пред тобою широкий лежит,
Солнце взошло над твоей головою,
Будешь свободной гражданкой ты жить.

Кастрычнік і працоўная жанчына.

10 гадоў таму назад адбылася Вялікая Кастрычнікавая рэволюцыя. Пад кіраўніцвам т. *Леніна* і Комуністычнай партыі пролетарыят нашай краіны ўзяў у свае рукі ўладу і ў цесным саюзе з сялянствам пачаў кіраваць аднэй шостай часткай усяе зямное кулі.

Вялікія былі цяжкасьці, з якімі прышлося спатыкнуцца рабочай клясе нашай краіны пасьля Кастрычніка 1917 году.

На працягу 10 год работніцы і сялянкі напружна адстаіваюць вялікія заваёвы Кастрычніка. Разам з Чырвонай арміяй яны былі на фронце грамадзянскай вайны. Разам з усімі працоўнымі яны змагаліся з голадам, холадам, з гаспадарчай разрухай.

Цяпер, калі ўсе няўзгоды пераможаны, работніцы і сялянкі аддаюць усе свае сілы на падняцьце вытворчасьці, сельскай гаспадаркі. Прымаюць усе меры да таго, каб калісьці жабрачую краіну ператварыць у краіну з багатай прамысловасьцю, якая здавальняла-б усе патрэбы працоўнага насельніцтва.

Кастрычнікавая рэволюцыя, як рэволюцыя пролетарская, уцягнула ў свае шэрагі найшырэйшыя масы працоўных. Сярод гэтых масаў нямалую ролю ігралі і працоўныя жанчыны, найбольш прыгнечаныя з прыгнечаных.

Кастрычнік даў усе правы жанчыне. З раней прыгнечанай, забітай, няграматнай, прыніжанай ён зрабіў яе раўнапраўнай грамадзянкай Савецкага Саюзу.

Цяпер жанчына мае права ня толькі выбіраць у органы кіраўніцтва краінаю, але мае права і быць на чале іх. Такіх правоў ня маюць працоўныя жанчыны ні ў аднэй з капіталістычных краін.

Па БССР абрана ў 1927 годзе ў сельсаветы 1726 жанчын-сялянак, старшынь сельсаветаў—14, у местачковых саветах—95, старшынямі местачковых саветаў—3, у склад РВК абрана 172, старшынёй РВК—1, у склад гарсаветаў абрана 580, Акрвыканкомаў—39, у склад ЦВК БССР—30.

Вылучаны з складу членаў ЦВК у цэнтральныя ўстановы 3 жанчыны, якія працуюць у Наркамфіне, Наркамгандлю, Наркамасьвеце і ўдала спраўляюцца са сваёй працай.

З году ў год расьце лік сялянак—грамадзкіх працаўніц, расьце актыўнасьць працоўных жанчын. Вялікую ролю ў гэтых адносінах маюць дэлегацкія сходы работніц і сялянак, якія організоўвае партыя. За 10 гадоў дэлегацкія сходы падрыхтавалі тысячы працоўных жанчын для працы ў саветах, профсаюзах і іншых грамадзкіх організацыях.

Толькі ў 1926—27 годзе прайшло школу дэлегацкіх сходаў у гарадох 4.786, у вёсках 22.981 жанчына.

Да рэволюцыі работніцы прымалі нязначны ўдзел у профэсыянальным руху. Толькі пасьля Кастрычнікавай рэволюцыі яны пачалі ўцягвацца ў агульнае ўлоньне (русло) профсаюзнага руху. Лік організаваных работніц у профсаюзы павялічаецца з кожным годам. Зараз мы маем у профсаюзах па БССР 53.105 жанчын. Разам з гэтым павялічаецца ўцягненьне работніц у саюзныя органы: к VI-му зьезду профсаюзаў уцягнута ва ўсе саюзныя органы 3.329 работніц. Расьце таксама колькасьць работніц, працуючых у вытворчасьці; у цэнзавай прамысловасьці БССР з 3.449 (на 1/VII—25 г.) павялічылася да 5.853 (на 1/I—27 г.).

Дапускаючы жанчын у вытворчасьць нараўне з мужчынамі, Савецкая ўлада клапацілася аб ахове жаночае працы. Самым важным заваяваньнем Кастрычніка ў галіне аховы жаночае працы зьяўляецца ахова работніцы мацеры. Яна атрымоўвае дэкрэтны водпуск па цяжарнасьці на 2 месяцы да радоў і 2 месяцы пасьля радзін з захаваньнем пэнсіі. Выдаецца пэнсія страхкасамі нізка аплачываемым групам работніц і жонак рабочых; адначасова—дапамога на пасаг дзіцяці і на працягу 9-ці месяцаў на кармленьне.

Савецкая ўлада таксама клапоціцца аб эканомічным паляпшэньні становішча сялянкі. Ужываюцца меры да палягчэньня яе працы цераз прасоўваньне ў вёску ткацкіх, прадзільных варштатаў, мяльніц, лёнатрапальніц і г. д.

Вялікую ролю ў справе эканомічнага паляпшэньня сялянкі павінна адыграць коопэрацыя. Дзеля гэтага сялянкі павінны ня толькі быць пайшчыкамі, але і актыўнымі працаўніцамі ў самой коопэрацыі.

„Вызваленьне жанчыны нямысьліма бяз удзелу саміх жанчын"—вось што сказаў т. Ленін.

Ахова мацярынства і младзенчаства зьяўляецца дасягненьнем Кастрычніка. За гэтыя 10 гадоў мы і тут маем вялікія дасягненьні.

10 гадоў таму назад з Кастрычніка 1917 году працоўная жанчына Савецкага Саюзу стала выступаць на шлях, паказаны ёй т. Леніным. Шлях гэты цяжкі, але адзіны шлях, які прывядзе яе да перамогі.

Трывалыя, стойкія і сьмелыя, яны будуюць новае жыцьцё без суятні, без траскучых фраз, не паддаючыся паніцы перад цяжкасьцямі, якія сустракаюцца на іх шляху. Яны цьвёрда ведаюць, што перамогшы ў Кастрычніку 1917 г., перамогуць і зараз.

Н. Танаеўцава.

СЕЛЬГАСПАДАТАК ДА 10-ай ГАДАВІНЫ.

У. І. Ленін казаў, што дзеля посьпеху рэволюцыі патрэбны правільныя ўзаемаадносіны паміж рабочымі і сялянамі. Гэтыя словы помніць кожны комуніcты, але іх павінен ведаць і кожны працоўны, бо з іх відаць, як цэняць партыя і рабочая кляса свайго саюзьніка—селяніна. Разумеецца, ня кожны селянін—іх саюзьнік. Кулак, у якога зямлю абрэзалі і падатку бяруць шмат,—ён-бы зьеў і комуністых і рэволюцыю, калі-б меў зубы. А вось сьвядомы бядняк і серадняк—помняць што к чаму, і ідуць за партыяй і рабочай клясай.

Як выконвае Савецкая ўлада завет ІЛЬЛІЧА? Якую лінію яна трымае з сялянствам? Гэта можна праверыць у кожным пытаньні. Я раскажу пра падатак, бо па пастанове ЦВК БССР ужо два гады працую на гэтай справе і ведаю яе лепш, чымся другія.

10 гадоў назад была харчовая разьвёрстка. Хто яе помніць, той ведае, што бралі ўсё лішняе, пакідалі селяніну толькі на пражыцьцё і насеньне. Бывала так, што і гэтага не пакідалі. Цяжка адбілася разьвёрстка на сельскай гаспадарцы, бо трэба помніць, які быў час: на Савецкую дзяржаву насядалі ворагі, трэба было накарміць Чырвоную армію, галодных рабочых, падтрымаць гібнучыя фабрыкі і заводы.

т. Самахвалава.

Скончылася вайна, скончылася і разьвёрстка. Увялі харчовы падатак. У селяніна ўжо бралі толькі частку, астатнім ён распараджаўся, як хацеў. Апрача таго, гэта частка бралася больш з заможных, менш з серадняка і зусім малая з бедняка, але і ён плаціў. Да і серадняку харчпадатак быў неспадручан: бралі і з зямлі, і са скаціны, і з сенажаці; сабіралі і зярно, і мяса, і сала, і шэрсьць і г. д. Апрача харчпадатку былі гужпадатак, масьляны падатак, падворны падатак. Усе падаткі былі натуральныя, бо рубель быў ня варт нічога. Селянін вазіў падатак у Заг. кантору, цягаўся з ім па прыёмным пунктам, стаяў у хвасьце са сваім дабром.

Паправілася народная гаспадарка, пусьцілі ў ход фабрыкі і заводы, умацавалі рубель і ўвялі грашовы сельска-гаспадарчы падатак. Гэта ўжо было больш спадручна для селяніна. Апрача таго, аб'ядналі ўсе падаткі ў адзін, вызвалілі ад яго частку бяднейшых гаспадарак, зьнізілі яго серадняку і павялічылі кулаку. Нарэшце устанавілі шэраг палягчэньняў сем'ям чырвонаармейцаў, інвалідаў і далі шмат ільгот тым, хто паляпшае свае гаспадаркі.

Але і грашовы сельгаспадатак да мінулага году быў ня зусім правільным. Яго лічылі з зямлі, сенажаці і скаціны, ня лічачыся з другімі даходамі. Частка заможніх і кулацкіх гаспадарак плаціла ня шмат, вызваляліся ня ўсе беднякі. І загэтым у мінулым годзе яшчэ раз пераглядзелі сялянскі падатак, спрасьцілі і палегчылі яго. Сталі падлічваць даход ня толькі ад асноўных, але і ад пабочных заработкаў. Устанавілі неабкладаемы мінімум даходаў, пашырылі ільготы ваеннаслужачым, маламоцным гаспадаркам, зямляўпарадкаваным гаспадаркам і г. д. Гэты парадак з невялікімі папраўкамі захоўваецца і зараз.

Што-ж сталася з сялянскім падаткам за 10 гадоў рэволюцыі?

Падатак зьменшыўся у разьмерах, стаў лягчэй. Замест усіх „зьлішкаў" сялянства плаціць цяпер усяго 5½ проц. свайго агульнага даходу.

Падатак стаў справядлівей. Чацьвертая частка ўсіх гаспадарак ня плаціць яго зусім. З сярэдніх гаспадарак сабіраецца па падатку ад 7 да 10 процантаў іхняга даходу. А заможны, кулак, плаціць ад 20 да 23 проц. свайго даходу.

Падатак стаў спадручней для селяніна. Яго плацяць грашыма ў тры тэрміны, у касу свайго Райвыканкому альбо ў бліжэйшую паштова-тэлеграфную кантору. Яго здаюць колектыўна цераз сельсавет адразу цэлымі вёскамі. Аклад яго вылічаецца шмат прасьцей, чым раней, і кожны селянін ведае яго за доўгі час да плацяжа.

Устаноўлен цэлы шэраг ільгот: зямляўпарадкаваныя гаспадаркі вызваляюцца ад падаткаў на 1—5 гадоў, чырвонаармейскім сем'ям даецца скідка ў разьмеры 25 проц. падатку, а некаторыя нават звальняюцца. Пастрадаўшым ад стыхійных навал зьнімаецца ўвесь альбо частка падатку. У распараджэньні раённых падатковых камісій ёсьць асобны скідачны фонд на ільготы іншым маламоцным гаспадаркам. Другая частка ільгот заахвочвае сялян да паляпшэньня сельскай гаспадаркі: ільготы па пасеву лёну і канапелі (50 проц. скідкі з абкладаемага даходу), вызваленьне ад падатку племянное скаціны, насеньнікаў, сеяных траў і г. д.

Нарэшце, на ²/₃ сельгаспадатак зьвяртаецца селяніну для яго непасрэдных патрэб (2-3 проц. адлічаецца ў раённы і акруговы бюджэт) і толькі астальная ¹/₃ ідзе на агульна-дзяржаўныя патрэбы.

Такі сельгаспадатак да 10 гадавіны Кастрычніка. Толькі рэдкі і вельмі несьвядомы селянін і сялянка цяпер не разумеюць, што сельгаспадатак патрэбен, каб існавала і расла рабоча-сялянская дзяржава, каб ня селі ўзноў на нашу шыю цар, абшарнік і фабрыкант. Але за 10 гадоў падатак стаў шмат лягчэй, справядлівей, лепшым.

Комуністычная партыя і Савецкая ўлада выконвае заветы свайго правадыра, трымае правільную лінію ў адносінах да сялянства.

Член ЦВК БССР, сялянка-
вылучэнка **Е. Самахвалава.**

НА ЗАЩИТУ ЗАВОЕВАНИЙ ОКТЯБРЯ.

Узмацненьне ваеннай моцы нашага Саюзу ёсьць чарговая задача ўсіх працоўных. Умацаваньне ваеннае павінна апіраццa на ўмацаваньне гаспадарчае і палітычнае.

ЦВК СССР заклікае ўсіх працоўных спрыяць усімі сіламі гэтаму ўмацаваньню.

(З маніфэсту ЦВК СССР да 10-ай гадавіны Кастрычніка)

Працуем.

У м. Асьвей 30-VIII організаваўся ваенна-санітарны гурток з 40 чалавек дзяўчат, з іх 27 беспартыйных. Прынялі праграму занятак, разьлічаную на шэсьць тыдняў, па чатыры гадзіны ў тыдзень.

1-IX было першае заняцьце „о поломе костей". Актыўнасьць з боку слухачоў была вялізарная. Было шмат слухачоў, акрамя запісаўшыхся, з просьбай іх зачысьліць у гурток. З боку слухачоў ёсьць пэўная думка даведваць заняткі да канца праграмы. Кіраўніком зьяўляецца раённы ўрач.

Ёсьць надзея, што гурток прынясе добрую карысьць у сэнсе культурнага будаўніцтва вёскі і абароны нашай краіны. **Жукава.**

Первый выпуск санитарного кружка.

(гор. Могилев).

Ровно в 7 час., без опозданий, товарищи собираются на занятия санитарного кружка (при Женотделе). Почти не было ни одного раза, чтобы отсутствовал тот или иной товарищ из записавшихся. Все слушают лектора с напряженным вниманием.

Практические занятия в больнице также проходили с большим интересом. Кроме экскурсий, где мы производили разные перевязки, обходили больных, получали об'яснения каждой раны и болезни, осматривали в микроскоп разные бактерии, узнавали их значение в нашем организме. У нас ежедневно происходили дежурства по 4 товарища, которые под наблюдением врача производили разные работы, относящиеся к подаче первой помощи.

Было заслушано несколько лекций военного врача.

Занятия первой ступени кончились.

Назначена проверка работы кружка.

Встречаю на улице тов. Могучую, которая говорит: „Я так волнуюсь, как девочка перед экзаменом".

Встречаю другую, она не меньше волнуется. Это характеризует, насколько товарищи интересуются вопросом.

В результате экзамена, из всех нас слабовато знали только 3-е и то те, которые по уважительным причинам не могли посещать аккуратно.

Конечно, нам не хотелось бы остановиться на этом, а продолжать занятия, хотя бы до тех пор, пока мы не получим звания красных сестер.

Ц. Гребнева.

Нядаўна арганізавалі другі гурток—стралковы.

(м. Койданава).

З пачатку жніўня з'арганізаваўся гурток скорай дапамогі, які наведвалі ўсяго 20 жанчын. Але пасьля таго, як быў склікан міжсаюзны сход работніц і служачых сумесна з жонамі рабочых і служачых, на якім стаяла пытаньне аб міжнародным становішчы і ўдзеле жанчын у абароне краіны, у гурток запісалася больш 40 жанчын і, апрача гэтага, з'арганізаваўся другі гурток—стралковы.

Гурткі працуюць рэгулярна адзін раз у тыдзень. Наведваемасьць і зацікаўленасьць добрая. Як вынікі—некаторыя жанчыны ўжо добра навучыліся разьбіраць вінтоўку і ведаюць элемэнтарныя правілы аказаньня скорай дапамогі. **Л.**

Ваенізуемся.

(Лагойск, Меншчына).

У м. Лагойску ячэйкай Осоавіахіму, сумесна з райжонаддзелам, месяц таму назад арганізаваны гурток „Скорай дапамогі".

Жанчыны вельмі зацікавіліся гуртком і зразу стала наведваць больш 30. Ужо было 4 заняткаў, на адным з заняткаў знаёміліся з вінтоўкай, каб умець страляць.

Дзякуючы доктару т. Нахамчыку, які чытае лекцыі, заняткі заўсёды вельмі цікавыя і зразумелыя, за што яму жанчыны вельмі ўдзячны.

Адно кепска, што з слухачоў—сяброў гуртка ў большасьці—моладзь, мала дарослых жанчын і мала сялянак—усё то служачыя, то саматужнікі.

Трэба над гэтым каму-небудзь задумацца.

М. К.

ПЕРЕВЫБОРЫ ДЕЛЕГАТОК.

Что получили делегатки.

(*Наровлянский район, Мозырского округа*).

Ответ был дан самими делегатками на собраниях. Мы получили толчок в политическом развитии, можем разбираться в политических вопросах. Нас удовлетворяет, что делегатские собрания приспособились к национальным потребностям, ведя работу для полек на польском языке, для евреек на еврейском. Мы выдвинули из своих рядов Председателя Национального Совета и Зам. предс. с/с. Нас притянули к посещению общих собраний партийных ячеек (посещает 70%). Личной инициативой устроили в дер. Дерновичи женуголок, на свои средства устроили площадку, ясли.

Делегатки просили, чтобы в будущем улучшили постановку работы практикантоk, так как общественные организации относились к ним плохо, не нагружали практической работой. **М. Гендельман.**

Як мы працавалі.

У кастрычніку месяцы 1926 г. быў абраны новы склад жанчын-дэлегатак па г. Воршы. У гэты склад увайшлі жанчыны-работніцы і жонкі рабочых. З гэтага часу пачынаюць склікацца дэлегацкія сходы, на якія жанадцзелам запрашаюцца дакладчыкі ад той альбо іншай установы. Гэтыя дакладчыкі яскрава асьвяцілі нам, дэлегаткам, жыцьцё і становішча нашай краіны і жыцьцё замежных краін, жыцьцё і становішча нашай жанчыны і жыцьцё жанчыны замежных дзяржаў.

Гэтыя сходы прынясьлі шмат карысьці жанчынам у сэнсе палітычнага разьвіцьця. Тут жанчына зразумела сваю незалежнасьць і стала разважаць, як-бы ёй быць удзельнікам у будаўніцтве соцыялізму. На дэлегацкіх сходах прывучылі жанчыну быць арганізаванай, а таксама прывучылі к грамадзкай працы, бо амаль усе жанчыны былі прымацованы к тэй або іншай сэкцыі Горсавету, дзе ім давалася грамадзкая праца, якую дэлегаткі выконвалі з вялікаю ахвотаю,—з гэтага відаць, што наша жанчына прывучаецца працаваць у грамадзе. Наогул трэба сказаць, што дэлегацкія сходы прынясьлі шмат карысьці нашай жанчыне, а гэтым самым і прынясуць карысьць Савецкаму Саюзу.

Разам з гэтымі дасягненьнямі былі і недахопы, а іменна: на першых парах ня было сталага памяшканьня дзеля дэлегацкіх сходаў, што прымушала хадзіць з аднаго памяшканьня ў другое або разыходзіцца зусім, падругое, ня было сталага арганізатара, што таксама вельмі шкодзіла працы. Але ўсё гэта было спачатку, і калі прызначылі сталага арганізатара і падшукалі памяшканьне, справа пайшла як можна лепей, і зараз нашы дэлегаткі выносяць шчырую падзяку камуністычнай партыі за яе імкненьне зрабіць уздым культуры сярод жанчын Савецкага Саюзу.

Дэлегатка **Шыманоўская.**

На жаночым сходзе.

(*Менск, прыгародная чарта в. Лошыца-Німоршанская*).

Як толькі стала цямнець, з усіх канцоў вёскі па дзьве, па тры, па адной пацягнуліся жанчыны ў хату-чытальню. Цераз некалькі хвілін была поўная заля хаты-чытальні жанчынамі, між якіх зусім было мала мужчын.

Настрой жанчын быў вельмі добры, яны чагота з нецярпеньнем ждалі, гутарачы аб выбарах дэлегатак, аб выпуску школы кройкі, шыцьця і рукадзелья і г. д. Наступіў час, якога жанчыны чакалі. Пасьля дакладу пачаліся перавыбары дэлегатак. Падняўся бальшы шум. Кожная жанчына хацела выставіць сваю кандыдатуру ў дэлегаткі. Дэлегаткі, у ліку чатырох жанчын, былі абраны.

Далей прыступілі к абгаварэньню пытаньня выпуска школы кройкі, шыцьця і рукадзельля, якая была створана пры хаце-чытальні некалькі месяцаў таму назад шэф-вобшчаствам „Хлебопродукт". Разглядаліся рэчы, зробленыя выпускнікамі, якімі ўсе былі вельмі зацікаўлены. Разам з гэтым шмат таварышоў адзначала, што шэф-вобшчаства, саздаўшы гэту школу, раскачала жанчын ад спячкі. Яна цяпер і газэту чытае, і піша ў газэту, яна і на сходзе, яна і ў савеце і г. д.

З усяго вышаадзначанага відна, што лошыцканімаршанская жанчына прабудзілася, з пуглівайцёмнай жанчыны становіцца грамадзкая працаўніца. Ува ўсім гэтым нада аддаць прэдпачценя шэф-вобшчаству „Хлебопродукт". Трэба з гэтым сказаць, што-б Кастрычнікаўскага райкому жанарганізатар зьвярнуў на гэта ўвагу і пачаў што-небудзь болей углыблена праводзіць сярод гэтых жанчын. Сялькор **Цітаў Вас. Вік.**

Активность женщин растет!

19 сентября в м-ке Холопеничах состоялось собрание женшин, на котором были перевыборы делегаток и отчет делегации о ее работе. Полно набита комната женщинами. С интересом выслушивали отчет делегатки, которая в конце доклада выразила благодарность партии за втягивание женщин в общработу. Женщины в свою очередь подмечали некоторые недостатки, имеющиеся в работе делег. собраний, как-то: редкие были созывы делегаток и в дальнейшем просим чаще проводить среди них работу. После этого были перевыборы делегаток, каждая из присутствующих выставляла кандидатуры, высказывались за и против. Когда были намечены старые делегатки, присутствующие давали некоторым отводы, что „Вы, мол, не оправдали перед избирательницами звания передовой женщины. Избраны 26 делегаток, на которых вполне можно надеяться, что они оправдают звание передовой женщины и потянут за собою всю темную массу женщин. **Гальперин Бейля.**

м-ко Холопеничи, Минского округа.

Делегатки! В праздник Октября будьте примером организованности.

От делегатки—в партию.

(*г. Витебск*).

На Витебском спиртоводочном заводе, при перевыборах делегаток в 1926-м году, было избрано 10 чел. Аккуратно посещало собрания всего 6 ч. Остальные по целому ряду причин посещать не могли. Вопросы ставились разные—об индустриализации страны, о военизации, о кооперации и разные бытовые вопросы, интересующие делегаток. Нужно отметить, что большую пользу приносили вопросы практического характера: доклад директора, доклад ЦРК и др.

Я лично очень много узнала, усвоила. После меня стали интересовать и партийные собрания. Я подала заявление в нашу парт'ячейку и была принята в ряды Коммунистической партии.

Кроме посещения собраний, мы были прикреплены к разным секциям, комиссиям и т. д. Каждая делегатка шла работать в ту секцию, которая ее больше интересовала, где она чувствовала, что сумеет и для себя получить пользу и принять участие в непосредственной работе комиссии.

Я работала в профессиональной секции при делегатском собрании, в производственной комиссии при заводе. Кроме того, как выборная, работаю в бюро яч. МОПР, где нам удалось провести большую работу.

